Пролетарыи всех стран, соединяйтесь! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער פאַראייניקט זיך! Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się! Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

УМОВЫ ПАДПІСКІ: На 1 м-ц—90 к.; на 3 м-цы—2 р. 60 к. на 6 м-цаў—5 р.; на 1 год—9 р. 75 к. Зьмена адрасу: мясцовага—10 к., іншагароднага—20 кап. Падпіска і абвесткі прымаюцца: У Гал. Канторы газ. „Зьвязда" 63, трэці паверх, ад 9 гадз. раніцы да 3-х гадз. дня. У акруговых гарадох—у Бел. Дзярж. Выдавецтва і ва ўсіх книт.-газ. канторах.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок [illegible] (пасьля тэксту)—50 кап. [illegible] Ленінграда—1 р. [illegible] Згодна [illegible] бірэцца [illegible]

РЭДАКЦЫЯ—Г. МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральн. Камітэту камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Мен. АК КП(б)Б.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎН. КАНТОРА: 1) Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. дня: тэлефон № 10-74. 2) Сакратар рэдакцыі—ад 12 да 2-ое гадзіны дня, тэл. № 6-19. 3) Намы рэдактар (друкарня) ад 6 гадз. вич. тэл. № 6-42. Кіраўп. Гал. Канторай } тэл. № 731. Канторы абвестак і падпіскі }

НЯДЗЕЛЯ, 22 СТУДЗЕНЯ 1928 г.

№ 19 (2826)

Кошт асобнага нумару ўсюды 5 кап.

Год выданьня дванаццаты.

Аб загатоўках, аб экспарце і аб нашым апараце

Бюро ЦК КП(б)Б заслухала на гэтых днёх даклад аб ходзе загатовак сырцу і хлеба і аб выкананьні экспартнага пляну.

Выступаўшыя таварышы, якія пабывалі на мясцох, аднадушна канстатавалі, што калі і ёсьць некаторае палепшаньне ў рабоце нашых загатоўчых органаў, дык усё-ж гэта палепшаньне зьяўляецца зусім невыстарчальным.

Даклад і шырока разгорнутыя спрэчкі далі нам цікавейшы малюнак работы загатоўчых апаратаў, а разам з гэтым—апаратаў іншых нашых органаў.

Бюракратызм, нярухлівасьць, а часамі і злачынная нядбайнасьць—нажаль, застаюцца характэрнымі ўласьцівасьцямі гэтых апаратаў. А адгэтуль—і ўсе адмоўныя вынікі для жывое справы загатовак.

Як правіла, выяўлена вельмі слабое пранікненьне ў нізавыя арганізацыі дырэктыўных паказаньняў цэнтру; нізавыя працаўнікі, як правіла, слаба яшчэ ўявілі сабе важнасьць ускладзеных на іх задач.

«Дырэктывы не даходзяць на месцы, застаюцца ў прамежных звеньнях»—аднадушна канстатуюць пабываўшыя на мясцох таварышы. У тых-жа нямногіх выпадках, калі дырэктыва пападае куды трэба, яна часта прыходзіць туды ў выглядзе простага перадруку паказаньняў цэнтру. Ні прыстасаванасьці да мясцовых умоў і асаблівасьцей, ні паказаньняў на тэрміновасьць выкан ньня таго ці іншага распараджэньня, ні якіх-бы там ні было наогул паказаньняў і растлумачэньняў прамежныя апаратныя звеньні ня лічаць патрэбным даваць. Перасылаецца папросту менская дырэктыва па ўсіх сходах зьверху ўніз з шматлікімі надпісамі: «да ведама», «да кіраўніцтва», «да выкананьня» і г. д.—і толькі.

Такімі бяздушнымі адносінамі толькі і можна тлумачыць тое становішча, што ў загатоўчай практыцы ў БССР і дагэтуль маюць месца зьявішчы, якія даўным даўно ўсюды асуджаны, як, напрыклад, канкурэнцыя паміж загатоўцамі. Гэта канкурэнцыя прыводзіць да таго, што сяляне, чакаючы «лепшых часоў», устрымліваюцца ад прывозу, а то і ўжо прывезеныя вазы павараччаюць назад.

Зусім ясна выяўлена таксама, што на мясцох работа па спагнаньні страхавых і іншых плацяжоў ідзе далёка невыстарчальным тэмпам. Зразумела, такія адносіны зусім не зьяўляюцца спрыяючымі для справы загатовак.

Наглядаюцца і некаторыя скажэньні нашай клясавай лініі ў рабоце па загатоўках. Тут мы павінны з усёю рашучасьцю сказаць, што няўхільна змагаючыся са спэкуляцыяй, інтэнсыўна спагняючы плацяжы, мы не дапусьцім і ў малейшай ступені парушэньня тых правоў і пераваг, якімі карыстаецца вясковая беднота—наша апора ў вёсцы. Наадварот, іменна цяпер асабліва павінна быць узмоцнена наша ўвага да яе, і ўсе фонды, ёй прызначаныя, павінны рэалізавацца поўнасьцю.

Зварачае на сябе ўвагу няўменьне нашых загатоўчых органаў выкарыстоўваць прыватніка, асабліва ў адносінах загатовак экспартнага сырцу. Часта тут справа зводзілася да таго, што прыватнік атрымліваў амаль не манапольнае права на гэтыя загатоўкі, а наш уласны апарат адшываўся. І пры тым, які прыватнік? Не прасал, а гуртавік. Натуральна, што гэта прыводзіла да інэртнасьці нашага нізавога загатоўчага апарату. Такія выпадкі мелі месца ў Гомелі, Магілеве і некаторых іншых мясцох.

У адносінах экспартных загатовак наогул у нас шмат памылак, хоць плян за першы квартал у абсалютным сваім выражэньні і выкананы здавальняюча. Мы ўсё яшчэ невыстарчальна скапцэнтравалі сваю ўвагу на асноўных, найбольш эфэктыўных відах экспарту. Мала намі зроблена і ў адносінах адшуканьня новых відаў экспарту, новых яго крыніц.

І тут нам псуе справу ўсё тойла бяздушны апаратны фармалізм. Досыць зазначыць, напр., на такі факт. Месяц таму назад старшыня СНК тав. Галаўцэў зьвярнуўся да акруг са спэцыяльным лістам па пытаньнях экспарту. У лісьце зазначалася і важнасьць пытаньня і неабходнасьць праверкі таго, што робіцца, і прапанавалася паведаміць аб усім, што зроблена. Да гэтага часу, аднак, у адносінах гэтага лісту акругі нічога яшчэ не зрабілі.

Відаць таксама—«прынялі да ведама».

Адным словам, куды мы не павернемся ў нашай гаспадарчай рабоце, усюды натыкаемся на нярухлівасьць нашых апаратаў.

Такому становішчу павінен быць пакладзен канец.

Партыйныя арганізацыі павінны зрабіць адпаведныя вывады.

Бяздушнаму фармалізму, цяганіне, бюракратызму нашых апаратаў павінна быць абвешчана бязьлітасная барацьба.

Падтрыманьне партыі ўсяму сумленнаму, дзейнаму, ініцыятыўнаму ў нашых апаратах.

Вон з апаратаў усё заскарузлае, папярова-бяздушнае, што тармозіць жывую гаспадарчую справу!

Будзем памятаць

(9-га студзеня 1905 году)

Пельга падлічыць усе крывавыя злачынствы, якія зроблены царскім урадам. На яго загадзе сотні тысяч, мільёны людзей загінулі ў часе войнаў. У часе розных забастовак і паўстаньняў вернае цару войска расстрэльвала масамі рабочых і сялян. Дзесяткі, сотні тысяч рэвалюцыйных барацьбітоў былі павешаны, замучаны па турмах і ссылках.

Ніводнага з злачынстваў царскага ўраду ня будуць так памятаць працоўныя, як надзей «крывавае нядзелі»—9-га студзеня (ст. ст.) 1905 году. У гэты дзень на загадзе цара былі расстрэляны пецярбурскія (ленінградзкія) рабочыя, якія накіраваліся да Зімняга палацу прасіць цара палегчыць іх становішча. І цар «палегчыў»... Разам з вялікім князем Уладзімерам, Мікалай Раманаў распрацаваў крывавы плян задушэньня рабочага руху і загадаў адкрыць агонь па бязбройных рабочых. Залпамі страляллі цёмныя забітыя салдаты ў масы рабочых, якія ішлі да цара з абразамі, з царскімі партрэтамі.

Паводле паліцэйскіх данясеньняў, было больш тысячы забітых і больш дзьвюх тысяч параненых. Абурэньне рабочых нельга апісаць. Увечары пасьля расстрэлу, у пасобных раёнах Пецярбургу рабочыя пачалі будаваць барыкады, з-за якіх абстрэльвалі казакаў і войска.

Заслона спала з вачэй рабочых. «Прэч забойцу цара! Прэч агіднае самаўладзтва!»—было агульнае патрабаваньне рабочых мас.

Чаму-ж мы асабліва выдзяляем 9-га студзеня 1905 г. з усіх іншых выпадкаў царскае расправы над народам? Чаму гэты дзень павінны памятаць рабочыя і сяляне Савецкае краіны, у чым значэньне гэтых надзей?

9-га студзеня 1905 году «у нявісьменнай сялянскай краіне нарадзіўся рэвалюцыйны народ»,—пісаў аб гэтым дні Уладзімер Ільліч Ленін. Замест невялічкай кучкі рэвалюцыянэраў бальшавікоў, у шмат мільённых мас рабочых і сялян пад уплывам падзей 9-га студзеня зьявіліся тысячы правадыроў. 9-га студзеня 1905 г. быў тым штуршком, ад якога пачаўся рэвалюцыйны рух рабочых і сялянскіх мас. Рух гэты адгукнуўся і ў флёце, і ў арміі і прывёў да салдацкага паўстаньня, да ўзброеных сутычак адной часьці арміі з другой. Такім шляхам вялізная краіна з 130-мільённым насельніцтвам пачала рэвалюцыю. «Дрэмлючая Расія зрабілася Расіяй рэвалюцыйнага пралетарыяту і рэвалюцыйнага народу» (Ленін).

Рэвалюцыя 1905 году, пачаўшыся 9-га студзеня, была падрыхтоўкаю, першай ступеньню да Кастрычнікавае рэвалюцыі 1917 г.

Гэта была рэвалюцыя, якую пачалі рабочыя і якую шырока падтрымалі сялянскія масы.

9-га студзеня 1905 г. было тым паваротным момантам, калі гэтым разрозьненым выбухі рабоча-сялянскага руху зьліліся ў адну магутную рэвалюцыйную хвалю.

Гэтая хваля, ахапіўшы ўсю Расію, у канцы 1905 г. прывяла народныя масы да ўзброенага паўстаньня супроць ураду. Але сілы тады яшчэ не хапала, каб расправіцца з гвалтаўнікамі і прыгнятальнікамі народу. Рабочыя і сяляне былі разьбіты. Рэвалюцыя была затоплена ў крыві.

Але прайшло 12 год і рабочыя разам з сялянствам, атрымаўшы баявое хрышчэньне 9-га студзеня 1905 г., зноў падняслі рэвалюцыю, якая закончылася поўнаю перамогаю над царскім самаўладзтвам, памешчыкамі і буржуазіяй. Гэта была наша слаўная рэвалюцыя 1917 году.

Шастакоў.

Нямецкія мэталістыя ўпарта вядуць барацьбу

Прадажніцтва рэфармістых

БЭРЛІН, 20. Перагаворы аб урэгуляваньні канфлікту ў сярэднянямецкай мэталяпрацоўчай прамысловасьці закончыліся бяз ніякага выніку. З прычыны гатоўнасьці абодвых бакоў весьці барацьбу, міністэрства працы не адважылася абвясьціць пастанову трацейскага суду абавязковай. Рэфармісцкія лідэры сабатуюць патрабаваньне рабочых аб пашырэньні фронту барацьбы, зазначаючы, што згоды можна дасягнуць у парадку перагавораў. Рабочыя, як і раней, патрабуюць павялічэньня зарплаты на 15 пфэнігаў у гадзіну. Прадпрыемцы згаджаюцца толькі на 3 пфэнігі ў гадзіну.

Пад уплывам забастоўкі мэталістых у Сярэдняй Нямеччыне ажывіўся нясупынны забастовачны рух рабочых доменных печаў у Рызе і Грэдыцы (Саксонія). З прычыны няўдачы перагавораў з прадпрыемцамі, раённыя камітэты нямецкага прафсаюзу мэталістых у Грэдыцы і Рызе патрабавалі ад цэнтральнага камітэту саюзу пашырэньня фронту барацьбы, шляхам распаўсюджаньня яе на ўсе мэталюргічныя прадпрыемствы Саксоніі. У Рызе камуністыя ўнесьлі прапанову пачаць зборы ў фонд дапамогі бастуючым. Рэфармістыя гэтую прапанову адхілілі. Праўленьне рабочага каапэратыву ў Гале, начале якога стаяць камуністыя, пастанавіла аказаць матар'яльнае падтрыманьне ўсім пайшчыкам, якія бяруць удзел у забастоўцы, пачынаючы з другога тыдню забастоўкі.

Сумны лёс „безапаснасьці"

ВОДГУК „ДЭЙЛІ ГЭРАЛЬД"

ЛЁНДАН, 20. Орган ангельскае рабочае партыі „Дэйлі Гэральд" піша:

«Ангельскі ўрад сваім мэмарандумам камісіі па безапаснасьці не дазваляе ёй прыняць які-небудзь праект, які-б адпавядаў патрабаваньням многіх эўрапейскіх урадаў. Гэтая новая дэкларацыя кансэрватыўнага ўраду, якая зьявілася на 10-м годзе пасьля вайны, зусім не палмацоўвае надзей на разброеньне і выкананьне тых урачыстых абяцанак, якія былі даны на вэрсальскай мірнай канфэрэнцыі».

МЭМАРАНДУМ НАРВЭСКАГА ЎРАДУ

ПАРЫЖ, 20. Па зьвестках з Жэнэвы, там апублікаваны мэмарандум нарвэскага ўраду па пытаньні аб работах камісіі безапаснасьці. Мэмарандум прапануе ўзяць у якасьці ўзору лёкарскі дагавор і распрацаваць усеагульную згоду прымірэньчай працэдуры і арбітражу. Далей, мэмарандум прапануе ўключыць у згоду пункт, які-б абавязваў дзяржавы, якія бяруць у ёй удзел, прызнаваць абавязковымі пастановы рады Лігі Нацый, калі яны ўхвалены аднагалосна, ня лічачы галасоў прадстаўнікоў дзяржаў, паміж якімі адбываецца канфлікт.

Польска-літоўскія адносіны

ЗАСТАЮЦЦА НАПРУДЖАНЫМІ

КОЎНА, 20. Паводле паведамленьня „Летувіс", прадстаўнік польскага тэлеграфнага агэнцтва Орынг зьвярнуўся да лідэра хрысьціянскіх дэмакратаў Крупавічуса з прапановаю схіліць Вальдэмараса наладзіць дыплёматычныя зносіны з Польшчаю. Паводле вестак газэт, Крупавічус адказаў Орынгу, што ў вілекнісім пітаньні ён салідаран з Вальдэмарасам.

Паводле вестак „Летувос Жыніос", Орынг у сваіх гутарках у Коўні намякаў, што польскаму ўраду не застасецца нічога іншага, як весьці перамовы з Літвою праз Бэрлін. 19 студзеня Орынг выяжджаў у Мэмэль, дзе наведаў афіцыйных асоб. У гутарках ён зваў адказ літоўскага ўраду на польскую ноту адмоўным і выказваў погляд, што Польшча ня будзе сьпяшацца з перамовамі і падасьць скаргу ў Лігу Нацый. У Польшу Орынг вярнуўся, як зазначаюць газэты, з прычыны адмовы літоўскае ўлады адтэрмінаваць яму візу.

ПОЛЬСКІ ДРУК „ПУЖАЕ"

ВАРШАВА, 20. Польскі друк распаўсюджвае весткі, што ў бліжэйшы час урад Вальдэмараса падасца ў адстаўку, ці будзе зьвергнуты знутры. Орган Пілсудзкага „Глос Праўды" паведамляе з Коўны, што літоўскія анархічныя партыі настаналі „ўпарадкаваць унутранае становішча Літвы", калі Вальдэмарас будзе працягваць і далей сваю ня прымірымую палітыку ў адносінах да Польшчы.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

— У штаце Масачузэтс (П.-А. З. Ш.) забаставалі 2.000 рабочых абуткоўай прамысловасьці, з прычыны спробы прадпрыемцаў зьменшыць зарплату на 10—35 проц.

— З Пятавіі (Індаэзія) высылаюцца 7 кітайскіх рэвалюцыянэраў, абвінавачаных ў „падрыхтоўцы сусьветнай рэвалюцыі".

— У Будапэшце паліцыя арыштавала 22 асобы „на падазрэньні ва ўдзеле ў камуністычных арганізацыях".

— Румынскі вайсковы міністр унёс у румынскую рэвізійную раду праект капітарысу на рэарганізацыю румынскай арміі на працягу 12 год. Сума капітарысу складае 150 мільярдаў лей (лея—каля 1,2 кап.).

НАЧНОЕ РАДЫЕ

Ушанаваньне памяці Ул. І. Леніна.

МАСКВА, 21. У Бальшым тэатры адбыўся жалобны сход, прысьвечаны 4-й гадавіне са дню сьмерці Леніна. А 6-й гадзіне 50 хвілін увечары займаюць мейсцы за сталом прэзыдыуму т.т. Калінін, Бухарын, Рыкаў, Молатаў, Угланаў, Котаў, Будзённы, Касіёр, Сьцяпанаў-Скварцоў і інш.

Тав. Калінін адкрыў жалобнае пасяджэньне ўступнай прамовай.

Тав. Бухарын выступіў з дакладам на тэму „Ленінізм і праблема культурнай рэвалюцыі". Пасьля дакладу тав. Бухарына з кароткім паведамленьнем аб працы Інстытуту імя Леніна выступіў тав. Сьцяпанаў-Скварцоў.

Пасяджэньне закончылася жалобным канцэртам.

Ваенная кліка Польшчы прагне вайны.

ВАРШАВА, 21. Выступаўшы 19 студзеня на банкеце афіцэраў запасу рэдактар газэты ваеннага міністэрства „Польска Збройна" Эвэрт заявіў:

„Польская нацыя не вяла барацьбу са зброяй у руках за сваю самастойнасьць. За ве змагаўся Пілсудзкі і яго паплечніі. Таму народныя масы ня досыць добра ацэньваюць значэньне самастойнасьці дзяржавы. Польшчы неабходна крывавая вайна, на якой пралівалі-б кроў сотні тысяч чалавек. Толькі тады народныя масы ацэняць значэньне ўласнае самастойнае дзяржавы".

Пад гучныя воплескі ўдзельнікаў банкету Эвэрт агласіў тост „за голую шпагу ў руцэ Пілсудзкага".

На абарону 400 дзеячоў Грамады

Выканком МОПР'у зьвярнуўся да рабочых, сялян і працоўнае інтэлігенцыі ўсяго сьвету з наступнай адозвай:

—У Польшчы рыхтуецца яшчэ адзін страшэнны працэс. Гэта — працэс супроць Беларускай рабоча-сялянскай Грамады.

Вось ужо амаль год, як у турмах Варшавы і Горадні, Пазнані і Навагрудку, Беластоку і Вільні пакутуюць 400 лепшых прадстаўнікоў працоўнага насельніцтва Заходняй Беларусі, стойкія барацьбіты за нацыянальнае, культурнае і эканамічнае вызваленьне свайго народу.

З дапамогаю двух агэнтаў польскае дэфэнзывы—правакатараў Гурына і Бельскага,—на паказаньнях якіх створаны цэлыя тамы хлусьлівых абвінавачаньняў, польскі ўрад рыхтуецца разбурыць самую вялікую і ўплывовую партыю Заходняй Беларусі і асудзіць на доўгія гады катаргі яе актыўных кіраўнікоў.

Адміністрацыйная свавольства і тэрар польскае улады, нацыянальны ўціск з асабліваю сілаю абрушыліся на насельніцтва Заходняй Беларусі пасьля фашысцкага перавароту мінулага году. Зачыненьне беларускіх школ, прасьледваньне роднае мовы і культуры, прымусовая калёнізацыя, насаджэньне польскіх вайсковых перасяленцаў, безьзямельне падштурхнулі шырокія масы рабочых і сялян Заходняй Беларусі на барацьбу за сваё вызваленьне.

Грамада выказала гэтыя вызваленчыя імкненьні мільённых мас краіны. Яна кінула лёзунгі нацыянальнага самавызначэньня, аддачы зямель бяз выкупу, саюзу Заходняе Беларусі і Польшчы, рабоча-сялянскага ўраду Польшчы.

За паўтара гады свайго існаваньня Грамада разраслася ў стотысячную арганізацыю, якая налічвае 1.200 мясцовых аддзяленьняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Польскія капіталістыя і памешчыкі ўстрывожыліся за свае адабраныя ад беларускіх сялян землі і маёнткі. Урад Пілсудзкага ўбачыў у барацьбе Грамады за інтарэсы працоўных і самавызначэньне Заходняй Беларусі пагрозу для ўсёй сваёй захопніцкай палітыкі ў Заходняй Беларусі і перашкоду да падрыхтоўкі нападу на СССР. Каб забясьпечыць сабе тыл у задуманай ім вайне супроць рэспублікі працы—СССР, Пілсудзкі пачаў разгром стотысячнай Грамады і новую хвалю крывавага тэрару ў Заходняй Беларусі.

Без захаваньня нават так званай буржуазнай законнасьці былі арыштаваны пяць дэпутатаў сойму і разгромлены легальныя масавыя арганізацыі. Тысячы рабочых і сялян, кінутых у турмы, сотні скалечаных у засьценках дэфэнзывы, дзесяткі забітых на дэманстрацыях пратэсту, разгром каапэратываў і газэт, што мелі якія-колечы адносіны да нацыянальна - вызваленчага руху, арышт беларускіх прадстаўнікоў у сойме—гэта адказ Пілсудзкага на рух працоўных, якія змагаюцца за вызваленьне ад фашысцкага гвалту.

Працэс 400 кіраўнікоў Грамады і пяці грамадаўскіх соймаўскіх дэпутатаў зьяўляецца судом над стотысячнай арганізацыяй, зьяўляецца расправаю з нацыянальна-вызваленчым рухам у Заходняй Беларусі.

Выканком МОПР'у заклікае рабочых, сялян і працоўную інтэлігенцыю ўсяго сьвету ўстаць на абарону загнаных праў нацыянальнае меншасьці, праў Беларускае Грамады, праў дэпутатаў сойму на недатыкальнасьць. Сваім магутным пратэстам і выражэньнем братэрскае салідарнасьці ўсе працоўныя павінны прыйсьці на дапамогу сьмелым і сумленным барацьбітом за гэтую справу. Няхай ведаюць яны, што калі, дзякуючы паліцэйскаму свавольству, або правакатарскім мэтадам дэфэнзывы яны пакутуюць у царскіх турмах польскага ўраду, дык працоўныя ўсіх краін усёй душою з імі і ня зморацца энэргічна патрабаваць іх вызваленьня.

Няхай жыве братэрская дапамога барацьбітом за нацыянальнае самавызначэньне!

Няхай жывуць палітзьняволеныя Грамады!

Выканком МОПР'у.

••• ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ •••

НА 7 ГАДЗІН ПРАЦЫ

ПРЫ ПЛЯНАВАСЬЦІ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ, УЛІЧЫЛЬНЕНЬКІ РАБОЧАГА ДНЯ—УЗРАСЬЦЕ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦІ, БУДЗЕ ГРУНТ ДЛЯ РОСТУ ЗАРПЛАТЫ

Даклад т. Шмідта

МАСКВА, 20. Старшыня ўрадавай камісіі па правядзеньні 7-гадзіннага рабочага дня, наркамправы СССР тав. Шмідт на сходзе гаспадарнікаў у саве це зьвезьдаў дзяржпрамысловасьці і гандлю заявіў, што скарачэньне рабочага дня ў канчатковым выніку павінна прывесьці ве да вымяшэньня, а да павялічэньня прадукцыйнасьці працы. Але для гэтага трэба правесьці грунтоўную падрыхтоўку, рацыяналізаваўшы вытворчасьць, правесьці неабходнае перабсталяваньне, улічыльніць работу і канчаткова ажыць „работу з прахладцай".

Пры такой падрыхтоўцы ўдасца ня толькі зьберагчы зарплату на дасягнутым узроўні, але і забясьпечыць яе рост у далейшым у адпаведнасьці з ростам прадукцыйнасьці працы. Наша прамысловасьць яшчэ не падрыхтавана да ажыцьцяўленьня 7-гадзіннага дня. Пры пераводзе вызначаных фабрык на 7-гадзінны рабочы дзень, трэба было правесьці рад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў для ўзьвышэньня прадукцыйнасьці працы. Трэба было лепш скарыстаць абсталяваньне і перайсьці на работу на большы лік варштатаў; трэба было ў мэтах павышэньня прадукцыйнасьці працы палепшыць якасьць сырцу і пражы, звольніць рабочага ад дапаможных работ і перагледзець расцэнкі. Да ўсяго гэтага нават маскоўская тэкстыльная прамысловасьць была ня досыць падрыхтаванай. Акрамя таго, выявіліся труднасьці і в наборам кваліфікаваных рабочых, і в падрыхтоўкаю, недахват кватэр, рад труднасьцяй і недахопаў самай арганізацыі работ на фабрыках і г. д.

У мэталёвай, каменнавугальнай, у асноўнай хэмічнай прамысловасьці рацыяналізацыя і ўлічыльненьне работ зьвязаны з яшчэ большымі труднасьцямі. Для рацыяналізацыі тут трэба патраціць значна больш часу і сродкаў. Вось чаму трэба захаваць неабходную асьцярожнасьць пры пераходзе на 7-мі гадзінны рабочы дзень. Імкненьне рабочых паскорыць пераход на 7-гадзінны рабочы дзень зразумела, але ажыцьцёвіць гэты пераход у нідта кароткі тэрмін немагчыма. З прычыны практычных труднасьцяй пераход неабходна ажыцьцёвіць у строга-плянавым парадку.

Пасьля ажыўленых спрэчак, нарада ўхваліла абрацъ спэцыяльную камісію для распрацоўкі рэзалюцыі па дакладу тав. Шмідта.

Прагненьне да міжнароднае культсувязі

МАСКВА, 20. У таварыстве культурнай сувязі з заграніцай адбылося пасяджэньне прадстаўнікоў навукочых арганізацый Масквы і Ленінграда. Прыехаўшы ў Маскву генэральны сакратар Інстытуту Ціха-акіянскіх зносін, што знаходзіцца ў Ганалулу (Гавайскія выспы), Дэвіс, у дакладзе аб мэтах і задачах гэтага інстытуту паведаміў, што інстытут нарыядчна склікае канфэрэнцыі для абгаварэньня пытаньняў, зьвязаных з вывучэньнем жыцьця, быту і культуры народаў пабярэжжа Ціхага акіяну.

У работах інстытуту бяруць удзел прадстаўнікі Японіі, Злучаных Штатаў, Карэі, Кітаю, Філіпін, Аўстраліі, Новай Зэляндыі і Гаваі. Кіраўнікі інстытутам прышлі да аднадушнага заключэньня, што арганізацыю інстытуту польга лічыць закончанай, пакуль СССР ня прыме ўдзелу ў яго дзейнасьці. Рад пытаньняў вельмі часта заставаўся нявырашаным на канфэрэнцыі з-за адсутнасьці прадстаўнікоў СССР. Акрамя таго, інстытут хоча атрымліваць інфармацыю аб жыцьці, быце і культуры народаў Саюзу непасрэдна ад яго прадстаўнікоў, не жадаючы карыстацца зьвесткамі з нявыўных крыніц заграніцкага друку.

У заключэньне Дэвіс перадаў афіцыйнае запрашэньне прыслаць прадстаўніка СССР на маючую адбыцца ў 1928 годзе канфэрэнцыю. Дэвіс зазначыў таксама на пажаданьсьць прысутнасьці на канфэрэнцыі прадстаўнікоў рабочых арганізацый СССР і сапецкага друку. Створаны часовы камітэт з 7 прадстаўнікоў розных навуковых арганізацый і Усесаюзнага таварыства культсувязі, якое займаецца распрацоўкаю арганізацыйных пытаньняў.

З усіх куткоў СССР

— 20-га студзеня ў Красным Сормаве, каля Ніжняга Ноўгараду, пачаўся тыраж пазыкі 1927 году. Тыраж працягнецца тры дні. У першы дзень разыграна 640 выйгрышаў на 100 руб.

— Адначасна з выпускам юбілейнага збору твораў Л. Н. Талстога будзе выпушчан зборнік артыкулаў крытыкаў-марксістых аб Талстым (У. І. Леніна, Плеханава, Аксэльрода, Луначарскага, Фрыча і іншых).

— З 1928 году пачынае выходзіць кнігапіс навуковае літаратуры, якая выдаецца ў СССР, а таксама, што была выдана з 1914 году да 1928 з. на тэрыторыі, увайшоўшай у склад СССР.

— Складзен плян электрыфікацыі дагестанскае прамысловасьці. Электрастанцыя зможа даваць энэргію і для бакінскага і для грозьненскага нафтапромыслаў.

Сямігадзінны рабочы дзень у беларускай прамысловасьці

Старшыня камісіі ВСНГБ па правядзеньні 7-гадзіннага рабочага дня ў беларускай прамысловасьці тав. М. Міленькі ў гутарцы з нашым супрацоўнікам заявіў: На пася джэньні камісіі, якое гэтымі днямі адбылося, мы заслухалі інфармацыю аб ходзе прапрацоўкі на прадпрыемствах пытаньня аб увядзеньні 7-гадзіннага рабочага дня.

У аснове гэтай работы павінны легчы наступныя асноўныя моманты: захаваньне ўзроўню заработнай платы, стабільнасьці сабекошту прадукцыі, забесьпячэньне кваліфікаванай рабочай сілай сырцом і кватэрай, мажлівае ўзмацненьне эксплёатацыі асноўнага капіталу.

У першую чаргу намі будуць распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па ўвядзеньні сямігадзіннага рабочага дня на Віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыцы, ільнапрадзільнай фабрыцы „Дзьвіна" і новай фабрыцы запалак у Рэчыцы „Днепр".

Побач з гэтым мы прызналі неабходным распрацаваць і падрыхтаваць пытаньне аб увядзеньні сямігадзіннага рабочага дня на прадпрыемствах, якія нанава будуюцца.

Я павінен зазначыць, што ўсе пляны па ўвядзеньні 7-гадзіннага рабочага дня намі будуць строга ўзгоднены з цэнтральнымі камісіямі пры СНК БССР і СНК СССР.

Мы нашу працу ўвязваем з працай адпаведнай камісіі ЦСПСБ, шляхам абмену думкамі, практыкай, а іншы раз і праз сумесныя пасяджэньні. Н.

„Бязьлітасны парлямэнтарысты"

Можа гэта на першы погляд і незразумела,—«бязьлітасны парлямэнтарысты»,—але інакш нельга назваць лідэра «Сялянскага Саюзу» пана Ярэміча. Ласьне ў гэтай постаці выступіў ён у сваім апошнім «маніфэсьце» («Сял. Ніва» № 2 1928 г.), які павінен выглядаць, як чарговая праграма невялікай купы яго аднадумцаў.

Вышаў «маніфэст» з прычыны ўтварэньня выбарнага буржуазнага блёку нацыянальных меншасьцяй Польшчы, ад імя часткі гэтага блёку «Беларускага цэнтральнага аб'яднанага выбарнага камітэту». Наколькі ён «цэнтральны» і «аб'яднаны»—трудна сказаць. Але што ён беларускі — у гэтым сумняваецца нельга. Вось таму ён нас нас і цікавіць.

На шпальтах «Сялянскае Нівы» складзены «маніфэст» у выглядзе сямі паасобных частак. Кожная з гэтых частак творыць паасобны разьдзел аб «правох і абароне беларускага народу».

Праўду кажучы, да гэтых разьдзелаў мала што можна дадаць: «абарона агульна-палітычных праў» і «змаганьне за зямлю»; «абарону лясоў і прыродных багацьцяў»; «змаганьне за правы і інтарэсы работнікаў» і «змаганьне за вымяшэньне падаткаў; «палепшэньне эканамічнага жыцьця» і «абарона роднае школы»... Словам, як кажа разьдзел VII: «змаганьне за ўсё, што вядзе да нацыянальнага, палітычнага і эканамічнага вызваленьня беларускага народу і яго лепшай будучыны».

Што можна дадаць да гэтых загалоўкаў? Нічога! «Кругом шашнадцать», як кажуць у Маскве, або «камар носу не падточыць», як кажуць у Менску.

І ўсё-ж такі ад чытаньня «маніфэсту» ня робіцца ні холадна, ні цёпла.

Дзе гэта мы ўсё чыталі? Калі гэта, ад каго, дай бог памяці,—мы гэта чулі?

Ба,—дык гэта стара-знаёмае! Сотні разоў чытанае!.. Гэта-ж яна самая, непадробная кераншчына, в яе бісьнем у персі, з яе «сьвятым (!) правам свабоднага самастаўленьня аб сваёй палітычнай і нацыянальнай долі» (уступ да «маніфэсту»). Як-жа не пазнаць!

Так «Сялянскі Саюз» у Вільні—гэта родны ўнучак калішняга Керанскага. Жыве курылка ў беларускай вопратцы, міла танцуе «танец дэмакратыі» і цешыцца ўсімі адпаведнымі слоўнымі цацкамі.

І сабе ня шкодна,—і другім прыемна.

«У імя гэтых (гл. вышэй) правоў, выбарны камітэт запаведуе (чаму не загадвае?) сваім выбарным людзям бязьлітасную парлямэнтарную барацьбу».

Вось яна—«бязьлітасная». Вось у які спосаб «запаведуе» пан Ярэміч самому сабе,—бо каму-ж іншаму «выбарнаму»? — зьдзейсьніць усе правы беларускага народу ў варшаўскім сойме.

Шляхам «бязьлітаснай» барацьбіны ў варшаўскім сойме. Зусім як «бяскроўны» Керанскі вядзейсьняў правы «расійскага народа» ў «демократическом совещании».

Дзе тут думаць аб крывавых кашулях бяроаўскай трагэдыі, аб сотнях расстраляных і замучаных па турмах. Дзе тут думаць аб месяцах і годах, на працягу якіх пакутуюць у сырых падвалах Вронак члены Грамады.

Прэч ад усяго, што прыгрудзе крывавую расправу, прэч ад панурых турэмных кратаў, прэч ад жандарскай плахі, на якую кладуць галавы сыны працоўнай беднаты.

Калі ёсьць гэраізм слоў—пашто гэраізм кандалоў? Калі ёсьць спрыт увільваньня,—ня трэба небясьпечнасьці простага чыну.

«Бязьлітасны парлямэнтарызм»!—які яскравы адбітак спэкулянцкага характару ярэмічаўскай палітыкі. У адным гэтым слове выказалася ўся яго істота.

І Ярэміч танцуе:

— Хочаце «права ўласнасьці на зямлю»—выбарны камітэт згаджаецца.

— Хочаце «сацыялістычнага карыстаньня ёю»—калі ласка, ёсьць і гэта.

— Вам падабаецца «веравань у бога» Ярэміч сьпяшаецца запэўніць, што і ён таксама ісьціна веруе (у праваслаўнага, вразумела).

— Вы атэісты, вольны філёзаф, —і Ярэміч выкідвае лёзунг аддзяленьня царквы ад дзяржавы.

Усё ёсьць,—усё купляецца і прадаецца.

Але затое: «бязьлітасны парлямэнтарызм», затое: «усе, як адзін, ідзем і аддайм свае галасы за сьпіс аб'яднанага камітэту».

Аднаго мы не разумеем: чаму та «Сялянскі Саюз» разыходзіцца і лаецца з панам (хоць і не да твару) Мамонька? І чаму ён ня можа знайсьці агульнае мовы з Пазарэўскім, Шапель-Шакуном, Валэйшай, мітрапалітам Дзянісам, Каўшом (што гэта яшчэ за Коўш?)—наогул са ўсімі вядомымі і невядомымі, якія таксама, як і Ярэміч, «шукаюць і працуюць».

Таленавіты супрацоўнік «Сялянскай нівы» п. Экран вельмі дасьціпна схарактарызаваў усіх гэтых дзеячоў польскага канстытуцыяналізму ў сваёй «Выбарнай фільме». Але аднаго не паказаў,—чаму яны разам з «Саюзам» ня могуць ісьці «як адзін» да выбарных урнаў.

Толькі таму, што Мамонька застаўся «пры пустых бутэльках»? Але гэта бяда малая: каса буржуазна-меншасьцёвага блёку лёгка можа іх напоўніць.

Таму толькі, што Назарэўскі «застаецца самотным на беразе». Але для таго і робяць блёкі, каб перацягваць з аднаго берагу на другі і быць у кампаніі.

Можа, урэшце, таму, што віленскія Бім-Бом, Шапель-Шакун «крылы лямі махаюць, а ляцець ня могуць»? Але і гэта рач напраўная.

Калі добра падпіразацца дэмакратычным палясом, ды ад'ядбіцца ў «бязьлітасным» перці парлямэнтарызму, дык і без крыльляў паляцець можна. Куды паляцець—у сойм, ці на сьметнік, адно ліха: усё роўна яны адзін ад аднаго ў блізкай адлегласьці.

Галоўнае важна, каб усе былі «дэмакраты». А гэтага, як вядома, і Мамоньцы і Назарэўскачу і Шапелям з Каўшамі не займаць стаць.

Мы не бярэмся здагадвацца, як пашанцуе пану Ярэмічу на выбарах. Можа быць

Жыцьцё партыі

Ці патрэбна двухступеннасьць у пачатковай палітасьвеце

(У парадку абгаварэньня)

Газэта „Правда“ свайчасова ўзьняла пытаньне аб мэтазгоднасьці існаваньня двухступеннасьці ў пачатковай палітасьвеце ў партыі і ў камсамоле.

Нездавальняючасьць і непрыстасаванасьць форм палітасьветы для партыйнаў і беспартыйных рабочых прымушае панова паставіць гэтае пытаньне на абгаварэньне. З прычыны таго, што майская пастанова ЦК УсеКП(б) аб паляпшэньні пастаноўкі палітасьветы ў партыі і ў камсамоле непасрэдна закранае гэтае пытаньне, то перш, чым перайсьці да гэтага пытаньня, неабходна сказаць, як праламлялася гэтая пастанова на мясцох у партыі і ў камсамоле. Вядома, што скарочаная школа зьяўляецца абавязковай ступеньню палітасьветы для кандыдатаў партыі, гэтак сама, як стацыянарка ці перасоўка ў вёсны. Маючы на ўвазе павышэньне тэарэтычнага ўзроўню партыйцаў і беспартыйнага актыву, ЦК партыі раіць для партыйнай масы і беспартыйнага актыву добраахвотны выбар форм палітасьветы.

Мы маем паўгадовую практыку рэалізацыі гэтае пастановы, і можна даць адказ наколькі яна сябе апраўдала. Трэба сказаць, што ячэйкі на мясцох ня досыць шырока растлумачылі новыя формы палітасьветы. Апоргі ячэек мала ўвагі ўдзялялі гэтаму пытаньню, дзякуючы чаму, у працэсе камплектаваньня партыйнай сеткі, ячэйкі зрабілі рад памылак. Мы прымушаны другі раз сьцьвердзіць гэтыя факты, бо ячэйкі на мясцох паўтараюць гэтыя памылкі. Апоргі ячэек пасылалі камуністых вучыцца ў зарадку партыйнай дысцыпліны ня толькі ў групу „А“ скарочаную, але і ў групу „Б“ нармальную, саўпартшколу і, нават, у вячэрні камвуз. Такая „папулярызацыя“ пастановы ЦК і „добраахвотная“ пасылка камуністых ішла ўразрэз з пастаноў ЦК УсеКП(б). Мы маем такія казусы, калі партыец (з ячэйкі спраўдому) не пажадаў вучыцца ў саўпартшколе і хацеў выбраць сабе іншую форму партыйнай вучобы. Тады апорг ячэйкі выклікаў да сябе гэтага таварыша і сказаў яму: „Ячэйка паслала цябе вучыцца, хоць што хочаш, а саўпартшколу наведвай“. Другі выпадак у вячэрнім камвузе. Студэнтка задае пытаньне лектару: „Скажэце т. лектар, ці ёсьць такое правіла ў партыі, што ячэйка павінна прымусова накіроўваць вучыцца ў камвузе“.

Трэба сказаць, што такое скажэньне і выправільнае разуменьне пастаноў ЦК аб паляпшэньні палітасьветы ў партыі больш усяго наглядалася ў нармальнай партыйнай школе. Адгэтуль вынікае і другі вывад, што партыйныя школы нармальнага тыпу камплектаваліся некалькі штучна, з прычыны чаго і атрымацца значны процант адсеву вучняў, каля 30—40 проц. і частковы пераход гэтых таварышоў у другія дабраахвотныя формы палітасьветы. Значыць, нармальныя школы ў значнай ступені абманулі. Гэта яшчэ ня можа служыць пераконваючым довадам, каб ліквідаваць двухступеннасьць груп у пачатковай палітасьвеце. Якія-ж у нас ёсьць падставы абараняць пункт погляду ліквідацыі двухступеннасьці і стварэньня адзінай партшколы, замест існуючых скарочанага тыпу і нармальнага.

Каб адказаць на заданае пытаньне, неабходна паставіць другое пытаньне. А ці ёсьць розьніца паміж групаю „А“ і „Б“ і калі гэта розьніца ёсьць, дык у чым яна выключаецца? Трэба зьвярнуцца да прапагандыстых кіраўнікоў школ, якія практычна займаюцца гэтаю справаю і яны даюць пастаўную адпоўку. Падручнік Пратасава для першай ступені, Грышына для другой адрозьніваюцца адзін ад другога, але палітычны ўзровень вучняў школы скарочанага тыпу і нармальнага амаль нічым не адрозьніваюцца. Натуральна, што прапагандыстым прыходзіцца прыстасоўвацца не да падручнікаў, а да аўдыторыі, атрымліваецца, што мэтад выкладаньня ў школах „А“ і „Б“ застаецца адзін і той-жа, ступень тэарэтычнай падрыхтоўкі тая-ж самая і адгэтуль вынікае вывад, што двухступеннасьць партыйных школ застаецца фармальнай.

Пачатковая палітасьвета ў партыі ахоплена зараз і будзе займаць другараздавае месца ў сыстэме ўсёй партвучобы. Гэта даказвае вялікая праслойка камуністых, якія маюць патрэбу ў прахаджэньні школы скарочанага і нармальнага тыпу. Новы прыцёк рабочых у партыю амаль ня будзе мець патрэбы ў прахаджэньні школы скарочанага тыпу. Гэта даказвае прыём рабочых у партыю кастрычнікавага закліку, дзе значны процант навучаецца ў школе нармальнага тыпу. Ніжэйшыя формы палітасьветы шырока адміраюць. І ўвесь цэнтр цяжкасьці трэба будзе зьвярнуць на вышэйшыя добраахвотныя формы. Што гэта спраўды верна, зацьвярджаюць даныя лічбы.

У пачатку 1927-28 навучальнага году было праектавана ўкамплектаваць па Кастрычнікавым раёне „А“ (скарочаных груп) 8 з абхопам 240 чал., „Б“ (нармальных груп) 8—240; укамплектавана „А“—4 групы—134 чал., „Б“—6 груп—216 чал.,—скарачэньне на 27 проц. Па Ляхаўскім раёне праектавана было 8 груп „А“—240 чал., „Б“ 7 груп—210 чал. Укамплектавана „А“ 4 групы—119 чал., „Б“ 4 групы—116 чалавек. Скарачэньне на 30 проц.

Па Гарраёне праектавана было „А“ 11 груп—330 чал., «Б» 9 груп—270 чал., „Б“ 6 груп—142 чал. Скарачэньне на 42 проц. Гэта разам з кастрычнікавым заклікам, што ў праект укамплектаваньня партсеткі не ўваходзіла.

Па ўсіх трох раёнах абхоп членаў партыі і кандыдатаў менскай партыйнай арганізацыі менш 16 проц. і на долю вышэйшых форм палітасьветы прыпадае каля 70 проц. абхопу арганізацыі. Гэта даказвае, што пастанова ЦК УсеКП(б) аб паляпшэньні пастаноўкі палітасьветы ў партыі цалком сябе апраўдала і ў значнай ступені палепшыла пастаноўку палітасьветы.

Па пытаньні камсамольскай школы ў нашым распараджэньні маецца зусім слабы матар'ял. І міркуючы па гэтых матар'ялах можна наперад сказаць, што двухступеннасьць школ ЛКСМ такая-ж самая, як і ў партыі. Трэба яшчэ дадаць, што камсамольскія школы яшчэ ў большай ступені, чым партыйныя не задавольваюць камсамольскай масы, асабліва ў першай ступені, што яны не карыстаюцца папулярнасьцю,—даказвае нізкае наведваньне іх, якое дасягае 30 проц. Зьвяримся да вёскі. Тут яшчэ ў большай ступені, чым у горадзе, шпарка пачалі адміраць ніжэйшыя формы палітасьветы—стацыянаркі і перасоўкі. Стацыянаркамі і перасоўкамі ахоплены мізэрны процант партыйцаў, так, напрыклад, на 13 раёнах Менскае округі стацыянаркамі ахоплена 11 проц. членаў партыі і кандыдатаў, перасоўкамі—1,5 проц. Абсалютная большасьць вучняў у гэтых школах—гэта беспартыйныя саматужнікі, рабочыя, камсамольцы і сялянe. Калі зьвярнуцца да гэтых форм палітасьветы на вёсны, дык ступень тэарэтычнай прапрацоўкі матар'ялу ў стацыянарцы ні чым не адрозьніваецца ад перасоўкі. Двухступеннасьць пачатковай палітасьветы ў горадзе трэба зьнішчыць і стварыць адзіную партшколу з адналетнім адзіным падручнікам.

У адносінах да камсамольскіх школ у горадзе зьяўляецца такая-ж патрэбнасьць, як і да партыйных. Перарослых камсамольцаў трэба перадаць у партыйныя школы.

Перасоўка на сяле сябе не апраўдала. Трэба скараціць многастароннасьць форм пачатковае палітасьветы і побач з прывіўшыміся палітгурткамі паставіць аднаступеннасьць партыйнай школы ў вёсцы. Для большай частві партыйцаў і беспартыйнага актыву мястэчка і сяла АПА АК раіць саўпартшколу першай ступені, індывідуальную самаадукацыю, гурткі самаадукацыі, прадметныя гурткі з кіраўнікамі і без кіраўнікоў і гурткі для партактыву і асабліва рэкамендуе шырокае распаўсюджваньне завочнае самаадукацыі, пры чым на дапамогу гэтым формам самаадукацыі з кіраўнікамі па лініі мэтодыкі і кансультацыі прыдзе бюро па самаадукацыі і кабінэт пры АПА АК.

І. СЕНІН.

Пытаньням вытворчасьці аддавалі шмат увагі

(Ячэйка КП(б)Б 2-е друкарні, Менск)

Прадпрыемства наша—невялікае, мае ўсяго 3 цэхі: наборны, машынны і літаграфскі. Умовы працы таксама ня зусім спрыяючыя. З боку гаспадарчых органаў, якія кіруюць друкарняй, зусім мала ўвагі зьвярталася на лепшае абсталяваньне друкарні, на рацыяналізацыю яе вытворчасьці.

Тым ня менш, ня гледзячы на ўсе труднасьці, партыйная ячэйка, дзякуючы ўпартай працы, дабілася значных посьпехаў у галіне кіраўніцтва гаспадарчай працай прадпрыемства.

У машынным аддзяленьні друкарні раней праводзілася праца выключна на плоскіх машынах, якія адбіралі шмат часу і рабочай сілы. Ячэйкай было пастаўлена пытаньне аб неабходнасьці набыць новую, двухальбомную машыну для друкарні. Гаспадарчыя органы проста жадалі сарваць гэтае неабходнае мерапрыемства, але энэргія, праўдзівая ў гэтым ячэйкай, перамагла, і машына ўжо ўстаноўлена.

Новая машына дае значную эканомію часу і лепшую якасьць вырабу друкарні. Балі на плоскай машыне надрукаваць 1.000 водціскаў каштавала 6 руб., дык новая машына дае зьніжэньне на палову.

Рацыяналізацыя была праведзена і ў наборным аддзяленьні. Ячэйка паставіла пытаньне аб неабходнасьці пераабсталяваньня наборнага аддзяленьня, дапаўненьня шрыфту і ўстанаўленьня новых рэалаў для наборных кас. Наборнае аддзяленьне зараз значна пашырылася.

Друкаваньне газэт зараз пераведзена ў 1-ую друкарню, а гэта мерапрыемства дало друкарні каля 300 руб. эканоміі ў месяц.

У літаграфскім цэху друкарні раней назіралася вельмі кепская якасьць працы рабочых. Ячэйка паставіла пытаньне аб тым, каб даць гэтаму аддзяленьню больш кваліфікаваных рабочых. Зараз якасьць працы гэтага аддзяленьня значна палепшылася: з боку заказчыкаў няма ўжо столькі скаргаў на дрэнную якасьць, як гэта было раней.

Зараз ячэйкаю вядзецца падрыхтоўка да пераводу рабочых на зьдзельную аплату працы, якая будзе ўведзена з лютага месяца гэтага году.

Трэба адзначыць, што ўсе высунутыя ячэйкай мерапрыемствы заўсёды падтрымліваліся рабочай масай друкарні. Гэтыя пытаньні абгаворваліся на шырокіх вытворчых нарадах рабочых.

Бязумоўна, што адным толькі кіраўніцтвам ячэйка-б усяго гэтага правесьці ў жыцьцё не змагла. Дзеля выкананьня ўсіх намечаных ячэйкай мерапрыемстваў патрэбны быў асабісты прыклад саміх партыйцаў.

М. З.

Пленум ЦК КП(б)Б

На 9-га лютага с. г. склікаецца пленум ЦК КП(б)Б з наступнай абвесткай дня:

1) Ітогі абгаварэньня пастаноў XV зьезду УсеКП(б) і задачы арганізацыі (т. Кнорын).

2) Вясеньняя сельска-гаспадарчая кампанія (т. Прышчэпаў).

3) Аб ходзе работы па ўзмацненьні заготовак хлеба і сыру і па ўзысканьні падаткаў і збораў у вёсцы (т. Галадзед).

4) Ітогі перавыбараў каапэрацыі (т. Васілевіч).

Да ведама выключаных з УсеКП(б)

ЦКК УсеКП(б) прапануе ўсім выключаным з УсеКП(б), ня здаўшым партыйных білетаў, безадкладна здаць іх у ячэйкі, у якіх яны лічацца.

Выключаным з УсеКП(б), якія знаходзяцца ў гэты час па-за тэрыторыяй тэй арганізацыі, з якое яны былі выключаны, прапануецца здаць партыйныя білеты ў бліжэйшую кантрольную камісію УсеКП(б), а апошняя аб здачы выключаных партыйных білетаў паведамляе тым КК, якія выносілі пастановы аб выключэньні.

ЦКК УсеКП(б).

ЗАГАТОЎКІ ў БССР

Загатоўкі сыравіны праходзяць слабым тэмпам ◆ Узмацніць барацьбу з тайным забоям жывёлы ◆ Невыстарчальнае кіраўніцтва нізавой каапэрацыйнай сеткай ◆ Больш увагі загатоўцы экспартных тавараў

АБ ХОДЗЕ ЗАГАТОВАК С.-Г. СЫРЦУ і АБ ЭКСПАРЦЕ

(У Савеце Народных Камісараў БССР)

Выслухаўшы даклад наркома Гандлю БССР т. Адамайціса аб ходзе загатовак сельска-гаспадарчага сырцу, Савет Народных Камісараў адзначыў вельмі нездавальняючы ход скураных загатовак і слабое выкананьне плянаў за 1-ы квартал як па БССР наогул, так і ў паасобку па Магілеўскай, Віцебскай, Бабруйскай і Менскай округах, а таксама слабое выкананьне пляну па загатоўцы скур сельска-гаспадарчай каапэрацыяй і невыстарчальнае выкананьне гэтага пляну з боку Скур. сындыкату і спажывецкай каапэрацыі.

Дзяржаўным і каапэрацыйным загатоўчым арганізацыям, а таксама і НК Гандлю, запрапанована прыняць рашучыя меры да павялічэньня загатовак скуранога сырцу праз узмацненьне загатоўчага апарату, а акрыванкомам зьвярнуць асаблівую ўвагу на выкананьне загатоўчымі арганізацыямі плянаў загатовак, сачыць за свайчасовым і поўным правядзеньнем у жыцьцё выданых пастаноў Эканамічнай Нарады і НК Гандлю БССР па аздараўленьні скуранога рынку.

Адзначаючы неаслабнуўшы тайны забой жывёлы, які мае ўплыў на ход скураных загатовак, СНК запрапанаваў НК Унутраных Спраў і акруговым выканаўчым камітэтам узмацніць мерапрыемствы па барацьбе з тайным забоем жывёлы, а НК Унутраных Спраў—распрацаваць праект па заахвочваньні працаўнікоў міліцыі і разьніц з мэтаю найбольшай пасьпяховасьці гэтай барацьбы. СНК таксама адзначыў слабое разьніцьцё загатовак ільну-валакна, асабліва слабое выкананьне пляну па Поладкай, Віцебскай і Магілеўскай округах. Белдзяржгандлю, Белсельсаюзу і Белкаапсаюзу запрапанавана зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўзмацненьне ільну-загатовак, у паасобку, прыняць рашучыя меры да поўнай здачы ільну гаспадаркамі закантрактаванымі, праводзячы ўсе меры націску, прадугледжаныя дагаворамі. Акрыванкомы павінны правесьці праверку выкананьня загатоўчымі арганізацыямі ўсіх дырэктыў па ўзмацненьні ільна-загатовак.

З мэтаю ўзмацненьня загатовак ільну-валакна НК Гандлю БССР запрапанавана забясьпечыць у першую чаргу здавальненьне хлебам ільнаводных раёнаў, у паасобку сялян, якія здаюць ільна-валакно дзяржаўным і каапэрацыйным загатоўчым арганізацыям, а таксама прызнана магчымым скарыстанне выдзелёнага фонду бавоўнянай мануфактуры на ільна-загатоўкі для ўзмацненьня задавальненьня выключна сялян ільнаводаў. Акрыванкомам запрапанавана не дапушчаць скарачэньня даных НК Гандлю БССР плянаў загатовак, узмацніўшы плянаваньне да нізавое сеткі.

СНК адзначыў, што ў галіне загатовак сырцу і другарадных відаў экспарту ў большасьці округ ня было выстарчальнага кіраваньня з боку акруговых каапэрацыйных саюзаў сваёй нізавой сеткай. Белкаапсаюзу і Белсельсаюзу запрапанавана ўзмацніць практычнае інструктаваньне і плянавае кіраваньне сваёй нізавой сеткай. З мэтаю большага задавальненьня рынку спажывецкімі таварамі ВСНГ БССР запрапанавана прыняць тэрміновыя меры да павялічэньня вырабу прадукцыі прамысловасьці, прыстасаваўшы гаты выраб да запатрабаваньняў мясцовага рынку, у паасобку попыту сялянства (абутак, адзеньне, сялянская мэблія і інш.). З прычыны невыстарчальнага задавальненьня ільнаводных раёнаў БССР хлебапрадуктамі і прамтаварамі, СНК пастанавіў узьняць перад вышэйшымі органамі СССР пытаньне аб узмацненьні завозу хлеба, мануфактуры і скураных тавараў у БССР. Пракурору Рэспублікі запрапанавана ў тэрміновым парадку разглядзець справы аб непадачы загатоўчымі арганізацыямі вестак аб загатоўках сельска-гаспадарчага сырцу і даць адпаведныя указаньні мясцовай пракуратуры аб тэрміновым разглядзе гэтых спраў.

СНК адзначыў, што хаця экспарт за 1-ы квартал быў амаль выкананы, аднак, гэтае выкананьне адбылося, галоўным чынам, з прычыны перавышэньня заданьня па вывазе шчаціны і грыбоў у той час, як другарадныя прадметы мелі ўдзел у экспарце ў невыстарчальнай ступені, а таксама адзначыў невыстарчальна разгорнутую працу па экспарце сельска-гаспадарчай і саматужна-прамысловай каапэрацыі, нізавая сетка якіх у некаторых округах зусім ня ўцягнута ў гэтую працу. НК Гандлю запранавана ўзмацніць экспарт, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на далейшае ўдасканаленьне ў экспарт другарадных відаў і на вывучэньне замежнага попыту. СНК прызнаў, што далейшае разьвіцьцё экспарту патрабуе ўтварэньня цьвёрдай экспартнай базы ў адпаведных галінах народнай гаспадаркі праз арганізацыю прамысловых і сельска-гаспадарчых прадпрыемстваў экспартнага значэньня праз арганізацыю распрацоўкі натуральных багацьцяў Рэспублікі для экспарту. З гэтай мэтай СНК прызнаў патрэбным тэрмінова прыступіць да ажыцьцяўленьня раду мерапрыемстваў, для чаго запрапанаваў НК Зямляробства ўзмацніць абсталяваньне рыбных гаспадарак з мэтай павялічэньня экспарту рыбы і ракаў, а таксама ўзмацніць увоз і пашырэньне племянных курэй, гусей і зьвярнуць увагу на разьвядзеньне трусоў. Белсельтрасту і Белсельсаюзу абсталяваць прадпрыемствы па засушцы і пераапрацоўцы ягад і гародніны з тым, каб яны маглі даць экспартны тавар. ВСНГ і Белсельтрэсту запрапанавана забясьпечыць магчымую выпрацоўку экспартнага крухмалу з ураджаю гэтага году, ВСНГ скончыць у гэтым годзе прадугледжаныя плянам па будовы заводу для апрацоўкі жолтыны, а таксама косьцапрацоўваючага заводу, абсталяваць удасканаленую апрацоўку і ачыстку завадзкое воўны. Прызнана патрэбным, каб па лініі мясцовай прамысловасьці быў пушчаны ў гэтым годзе завод па выпрацоўцы журавіннага экспарту, тэрмінова даабсталяваць вытворчасьці памерных сядзеньняў і сілінак для іх экспарту. Саматужна-прамысловаму саюзу даручана ў 2-х тыднёвы тэрмін распрацаваць і падаць у эканамічную нараду праект мерапрыемстваў аб экспарце саматужных вырабаў у паасобку мастацкіх, а таксама падаць плян канкрэтных мерапрыемстваў па пашырэньні смалакурэньня.

На ўсе гэтыя мерапрыемствы па пашырэньні экспарту СНК вызначыў арыентовачна дадатковыя затраты ў суме 600 тыс. руб., з якіх палова павінна быць адпушчана з агульна-саюзных сродкаў.

Ценевыя бакі загатовак

(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта)

ПОЛАЦАК, 21. У загатоўчай працы ў Полацкай акрузе выяўлена шмат ценевых бакоў і нават злоўжываньняў, якія перашкаджаюць ходу загатовак.

Так, старшыня спажывецкага т-ва ў Асьвеі, Яблыкаў прадаў 110 скур прыватнаму гандляру.

У Колышках, Дрысьненскага раёну старшыня сел.-гасп. таварыства Брэдэс замест таго, каб перадаць загатоўленыя скуры акрсельсаюзу, здаў 100 скур для пераапрацоўкі прыватніку, матывуючы гэта тым, што яму невыгодна здаваць сырэц саюзу.

У гэтым-жа таварыстве «спэцыялісты» па загатоўцы мяса Крумэр зьяўляецца дастаўшчыкам мяса для сельска-гасп. таварыства і для... свайго бацькі—прыватнага гандляра. Апошні працуе пад шыльдай «мясны гандаль спажывецкага т-ва». Такім чынам абодвы Крумэры—бацька і сын—пад фірмаю каапэратыву робяць свае цёмныя справы.

У Росіцы загадчык загатоўчага пункту Белдзяржгандлю Бяляеў пад уплывам прыватнікаў праводзіў агітацыю за зрыў кантрактнай здачы сялячамі ільну-валакна сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Пры гэтым Бяляеў распаўсюджваў сярод сялян чуткі аб тым, што быццам каапэрацыя прымае лён ад сялян па кантрактах на нумар ніжэй, чым ён каштуе па сваёй якасьці.

Усе справы аб дзейнасьці гэтых асоб перададзены пракурору для прыцягненьня спэкулянтаў і тых, хто зрываў загатоўчую кампанію, да судовае адказнасьці.

Для характарыстыкі працы сельска-гаспадарчай каапэрацыі можна прывесьці наступны яскравы прыклад.

Дрысьненскае сель.-гасп. таварыства пры паявым капітале ў 5.600р. мае запазычанасьць па пазыках пайшчыкам 8.800 р. Гэта азначае, што сродкі таварыства знаходзяцца ня ў касе каапэратыву, а на руках насельніцтва, і каапэратыў працуе «ў халастую».

На Сарбінскім прыватным млыне (Дрысьненскі раён) выяўлен запас жыта ў 1.500 пудоў, які быў сабраны па фунтах ад памолу.

Фінансавыя мерапрыемствы пачынаюць дакатвацца да вёскі і даваць некаторы эфэкт у сэнсе павялічэньня загатовак. Так, Дрысенскім сель.-гасп. таварыствам за два дні загатоўлена выкі 735 пуд., ільна-валакна—343 пуды. У тыя-ж часы ў Дрысьненскую райфінчасьць паступіла сельска-гаспадарчага падатку 701 р., страхавых збораў 478 руб., пратэрмінована пазык 605 руб. У Лепельскім раёне на адным прыватным млыне выяўлена 500.000 пудоў жыта. Гэты запас жыта будзе перададзены каапэрацыі па цьвёрдых цэнах.

СПРАВЫ КААПЭРАЦЫЙНЫЯ

Як павялічыць збор паявых узносаў

(У парадку прапановы)

У нумары 11 газэты «Зьвязда» за 13 студзеня г. г. у перадавіцы пісалася пра неабходнасьць узмоцненага збору паявых узносаў. Гэтае пытаньне ставілася, як першачарговая задача каапэрацыі.

Як практычнае мерапрыемства для збору паявых узносаў у рабочай каапэрацыі, мне здаецца, надзвычайна мэтазгодна ўстанавіць наступны парадак.

Пры выдачы крэдытаваньня рабочым і служачым дапускаць і, нават, вымагаць узнос поўнага паю, прычым у кошт паю браць боны ЦРК.

Гэткі парадак у значнай ступені дапаможа збору паёў і будзе выгодным, як для каапэрацыі, так і для пайшчыкаў. Калі замест грашовых узносаў паю каапэрацыя атрымае свае боны, дык ад гэтага яна ня траціць, бо так ці інакш дапушчае расклад узносу паю на некалькі тэрмінаў. Выйгрыш-жа той, што праз гэта збор паёў узмоцніцца і стане больш лёгкім і нармальным. Зараз-жа, як агульнае правіла, уплата паявых узносаў пратэрміноўваецца.

Пайшчык таксама мае ад гэтага карысьць, бо гэткі парадак зьмяншае клопаты аб свайчасовым узносе, пры чым узнос паю таксама фактычна раскладаецца на некалькі тэрмінаў—на час атрыманага крэдыту. Праўда, некаторыя катэгорыі пайшчыкаў, як бронь і інш., якія маюць раскладку ўзносу паю на значны пэрыяд, крыху ад гэтага трацяць, але перад гэтым суцяшацца нельга.

Мне здаецца, што прапанаваны мною парадак узносу паёў павінен шырока практыкавацца.

В. Ляшэвіч.

Барацьба з перапрадажамі недахватных тавараў

За апошні час сталі больш частымі выпадкі перапрадажы недахватных тавараў прыватным асобам. Ёсьць нават выпадкі, калі паасобныя спажывецкія таварыствы, атрымаўшы тавары ад сваіх саюзаў, не дастаўляюць іх у свой каапэратыў, а тут-жа, на месцы, перапрадаюць прыватным гандляром.

Супроць гэтых ганебных фактаў па трабуюцца самыя строгія і бязьлітасьныя меры барацьбы. Спажывецкая каапэрацыя і Наркамгандаль БССР прынялі наступныя меры барацьбы з гэтымі вадомымі зьявішчамі.

Каапэрацыйныя арганізацыі, якія адпускаюць недахватныя тавары сваім спажывецкім таварыствам, пасылаюць адначасова копіі рахункаў на гэтыя тавары рэвізійным камісіям, якія павінны правяраць фактычнае паступленьне гэтых тавараў у каапэратыў.

Злоўжываньні недахватным і тавараў з боку пайшчыкаў выяўляюцца у тым, што яны ўмудраюцца шляхам фальшывых заяў аб страце членскай кніжкі атрымаць другія кніжкі і, такім чынам, забіраць недахватныя тавары ў падвойным разьмеры. Або практыкуюць усякага роду падчысткі і перапробкі запісаў атрыманьня тавараў. Гэтыя злоўжываньні зьяўляюцца ня толькі парушэньнем сваіх абавязкаў перад каапэратывам, але яны павінны разглядацца, як крымінальныя злачынствы, якія маюць характар злоснага завышэньня цэн на тавары і парушэньня правіл аб гандлі. Таму яны павінны кацацца адпаведнымі артыкуламі крымінальнага кодэксу.

Злоўжываньні недахватнымі таварамі з боку служачых каапэратыву выяўляюцца у сваёвольным завяд[illegible] ці ў [illegible] нормы водпуску недахватных тавараў ці ў дакумэнце і пераадрэсаваньні ўгойваньні злоўжываньняў пайшчыкаў. Супроць гэтага трэба весьці барацьбу ня толькі мерамі адміністрацыйнага пакараньня, але і шляхам прыцягненьня да судовай адказнасьці.

Усе гэтыя вызначаныя меры могуць забясьпечыць посьпех толькі ў тым выпадку, калі ў барацьбу супроць злоўжываньняў недахватнымі таварамі будуць уцягнуты шырокія масы пайшчыкаў і ўвесь каапэрацыйны актыў.

І. Ф—н.

Беднякоў у праўленьнях пераважная колькасьць

БАБРУЙСК. (Уласн. кар.). Перавыбары кіруючых органаў нізавой сельска-гаспадарчай каапэрацыі адбываюцца пад знакам узросшай актыўнасьці пайшчыкаў. Папярэднія вынікі перавыбараў яскрава паказваюць, наколькі наша каапэрацыя заваявала аўтарытэт сярод насельніцтва. На сходах горача абгаворваюцца пытаньні па ўсіх галінах дзейнасьці сельсаюзу, які аб'яднае звыш 30.000 сялянскіх гаспадарак.

На перавыбарных сходах у крэдытных таварыствах удзел пайшчыкаў дасягае 70 проц., што дае павялічэньне супроць мінулага году на 20 проц. У нанова абраным складзе ўпоўнаважаных налічваецца 61 проц. беднякоў, 38 проц. сераднякоў і толькі 1 проц. заможных сялян. Лік прысутных на сходах няпайшчыкаў дасягае 30 проц.

Актыўнасьць жанчын супроць мінулага году значна ўзрасла. Жанчыны высоўвалі пытаньні аб арганізацыі дзіцячых ясьляў.

Склад праўленьняў калгасаў адноўлен на 38 проц.

Усе спробы кулацтва і заможнага сялянства правесьці свае прапановы і кандыдатуры натыкнуліся на дружны адпор з боку беднаты і сераднякоў. Толькі ў Турках быў абраны ў праўленьне адзін з кулакоў.

Ч.

Сельска-гаспадарчы падатак

Ліквідацыя недоімак

ВІЦЕБСК. (Уласн. кар.). На 16-да студзеня па Віцебскай акрузе паступіла сельска-гаспадарчага падатку і недоімак 77.364 р. або 80,33 проц. Упераадзе ўсіх ідзе Сіраціцкі раён, які выканаў 84,77 пр[illegible]

Тэмп узмоцніўся

БАРЫСАЎ. (Ул. кар.). Па Барысаўскім раёне за 16-га і 17-га студзеня паступіла сельска-гаспадарчага падатку ў суме 2.192 руб. Такім чынам, тэмп паступленьняў, дзякуючы прыняттым мерам, значна ўзмоцніўся.

Слуцак загатовіў 13.500 пуд.

СЛУЦАК. (Уласн. кар.) Дзякуючы прынятым мерапрыемствам па ўзмацненьні хлебазатовак, апошнія ўсё павялічваюцца. З 11 па 17 студзеня па мясцовых арганізацыях загатоўлена 13.529 пудоў. Асобныя арганізацыі, як ГОРПО асабліва відавочна павялічылі сваю загатоўку; так, за 1 дзень—17 студзеня загатоўлена 750 п. усіх культур, у той час, як раней найбольшая лічба загатовак складала каля 100 пуд. Гэта дало магчымасьць забясьпечыць горад хлебам. Да 11 студзеня адчуваўся востры недахват хлеба ў горадзе. Прыватнік скарыстаў такі момант і павялічыў цэны на булкі і хлеб. Цяпер гэта зьявішча цалком зьнішчана.

Для стварэньня большых магчымасьцей у загатоўцы, мясцовым аддзяленьнем Дзяржбанку ўзмоцнена фінансаваньне каапэрацыі: адпушчана аддзяленьню Белкаапсаюзу 30.000 руб.

Таемны забой скаціны

МАЗЫР. (Уласн. кар.). Мазырскім пунктам Скурсындыкату загатоўчы плян за першы квартал 1927-28 году ў параўнаньні з гэтым-жа кварталам 1926-27 г. выкананы наступным чынам па месяцах: кастрычнік даў павялічэньне ў параўнаньні з мінулым годам на 52,5 проц., лістапад памяншэньне на 23 проц. і сьнежань—памяншэньне на 9,4 проц. Наогул выкананьне пляну па месяцах за першы квартал выяўляецца: кастрычнік на 77,8 проц., лістапад на 60 проц. і сьнежань на 75 проц.

У загатоўках скурсырцу, ня гледзячы на значнае ўзмацненьне гэтай работы наглядаецца на мясцох рад труднасьцяй.

У цэлым радзе вёсак адбываецца таемны забой жывёлы прыватнікамі і такім чынам скурсырэц пераходзіць непасрэдна да прыватніка. Некаторыя прыватнікі нават умудраюцца прарабіць гэтую работу так: калі сельсавет ці міліцыя накрывае іх, дык сяляне заяўляюць аб тым, што мяса мы прадалі, а скуру застаўляем для сваёй патрэбы, і такім чынам даюць магчымасьць прыватніку заўладаць скурсырцом. З такімі выпадкамі трэба вельмі рашучую барацьбу, падняўшы на ногі сельскія саветы, міліцыю, вясковы актыў.

Трэба адзначыць, што ветэрынарыя ня досыць зьвяртае ўвагі таму, каб не дапушчаць таемнага забою жывёлы і каб скуры паступалі ў засолачныя пункты, на што неабходна будзе зьвярнуць увагу.

Шкоднікі хлеба

БАБРУЙСК. (Уласн. кар.). Самагонныя апараты, якія штогодна зьнішчаюць шмат хлеба, таксама зьяўляюцца аднэй з важнейшых перашкод у кампаніі хлебазагатовак.

Упартая барацьба з гэтай перашкодай, якая сыстэматычна вядзецца міліцыяй, мае значныя дасягненьні, але большасьць самагоншчыкаў яшчэ не выяўлены. Некалькі фактаў. За апошні год у самагоншчыкаў у нашай акрузе адабрана 6.937 самагонных апаратаў, 980 літраў самагону і 123.363 літры брагі. Супроць самагоншчыкаў за гэты час было узьнята 4.066 спраў.

Гэтыя самагоншчыкі панесьлі належную кару. З усяго ліку самагоншчыкаў затрымана толькі 17 чалавек накіравана на суд.

На вышуку новых самагонных апаратаў. За апошні час узьнята звыш 550 спраў супроць самагоншчыка Бабруйскай, Рагачэўскай і Жлобінскай раймілыцый. Глуская і Клічаўская раймілыцыі пакуль што яшчэ не раскачаліся.

Галоўным чынам, самагонам займаюцца заможныя сяляне, якія не жадаюць свой хлеб вывозіць на рынак, спад ячыся на атрыманьне ад яго большага прыбытку.

Ч.

Загатоўкі с.-г. каапэрацыі

Загадчык аддзелу загатовак Белсельсаюзу тав. Баршай паведаміў нашаму супрацоўніку наступнае адносна загатовак сельска-гасп. каапэрацыі:

— Паездка па загатоўчых раёнах даказала, што нізавая сетка з невыстарчальнай сурёзнасьцю аднеслася да загатоўчай кампаніі.

Гомель да нашага прыезду работы па загатоўках амаль не праводзіў. Прышлося склікаць сход, паказаць на ўсю важнасьць работы. Цяпер ужо адчуваецца пералом, і гомельская сельска-гаспадарчая каапэрацыя ўзялася моцна за загатоўку. У Бабруйскай акрузе, асабліва ў Случчыне, пачалі падвозіць хлеб, ячмень і іншыя хлебапрадукты. Вялікая ўвага была таксама зьвернута на загатоўку другарадных відаў экспарту. Нізавой сеткі дана раскладка, і няма сумненьня, што плян загатоўкі другарадных відаў экспарту будзе поўнасьцю выкананы.

Паступаюць ужо весткі з рабоў аб наступіўшым пераломе ў хлебазагатоўках. Так, з Шклова атрымана тэлеграма аб загатоўцы за апошнія толькі дві 1000 пуд. насеннага аўсу, 167 п. вікі, 250 п. ільнянога семя, з Бабруйску—аб загатоўцы хлеба-фуражу—15 вагонаў, ільна-семя—30 тон, з Віцебску—аўсу—21 тона, вікі—30 тон, ільна-семя—19 тон і [illegible]

Аб узмацненьні барацьбы з самагонакурэньнем

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, у сувязі з хлебазагатоўчай кампаніяй, зацьвердзіў абежнік на імя ўсіх акруговых і раённых выканаўчых камітэтаў аб узмацненьні барацьбы з самагонакурэньнем. Гэты абежнік рассылаецца ў тэрміновым парадку па месцы.

Просім нашых карэспандэнтаў пісаць, як проходзяць хлебазагатоўкі, асабліва ў далёкіх ад рынку раёнах.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ПА ТЭЛЕГРАФУ, ТЭЛЕФОНУ І ПОШТАЙ ад НАШЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ

Новы буйнейшы крухмальны завод

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта)

З чарговы сезон распачне працу новы найбуйнейшы ў акрузе крухмальны завод у Чарнеўскім сельсавеце. Завод зьяўляецца прадпрыемствам крухмальнай прамысловай арцелі, у склад якой уваходзяць дзьве камуны, дзьве арцелі, адно крэдытнае таварыства і некалькі вёсак.

Завод арцелі будзе вырабляць крухмалу больш, чым усе існуючыя заводы разам узятыя. 100 тысяч пудоў бульбы ў сезон—вось яго нагрузка. Абсталёваны ён будзе па апошняй тэхніцы і будзе выпушчаць сухі крухмал.

Арганізацыйная работа ўся праведена. Ёсьць і крэдыты, арцельшчыкі гатовы ўжо прыступіць да пабудовы заводу. Нажаль, зацягнулася зацьверджаньне статуту. Як толькі фармальнасьці па зьцьверджаньні статуту будуць пераможаны, зараз жа пачнуцца работы па пабудове бэтоннага будынку для заводу.

Таксама зімою закантрактуецца неабходная колькасьць будзьбы.

А з восені запрацуе завод.

К. Лапцеў.

Першы ў БССР с

Літаратура—крытыка—мастацтва.

Літаратурнае змаганьне, „аб'ектывізм" крытыкі ды інш. рэчы

Змаганьне на літаратурным фронце ня спыняецца. На полі бойкі, дзе дагэтуль ламалі коп'я два варожыя лягэры—з аднаго боку, «Узвышша», з другога—«Маладняк Полымя», на чорным паравозе пад'ехала «Літаратурная камуна». Да якое з старон ў зацятай бойцы далучыцца гэты апошні прадукт літаратурнай дыфэрэнцыяцыі—пакуль трудна сказаць. Зараз байцы «Камуны» скубуць пакуль што і адных і другіх.

А барацьба ідзе, як кажуць «ва ўсю». Да крыві. Стала яна такой зацятаю, што ўдзельнікі яе ў захапленьні забыліся нават аб мэтах, за якія распачалі гэтую крывавую бойку.

Больш таго, барацьба прыняла такія разьмеры, што ў яе ўцягнуліся ня толькі крытыкі, але і паэты, несьняры, і проста пісьменьнікі, кінулі пісаць свае вершы, навэлы, аповесьці і рашуча ўзяліся за зброю—і цяпер не разьбярэш—хто крытык, хто паэта. Нават паэма і тая зьяўляецца формай для прыкрыцьця крытычнай барацьбы. Сваімі «Кругамі» Дубоўка, напрыклад, проста цэліцца ў лоб праціўніка.

Вядома, што гэтая барацьба мае сацыяльныя падставы, ідзе змаганьне за ідэалёгію, за стыль, форму. Але, нажаль, гэтага няма на справе. Пакуль што мы зьяўляемся сьведкамі пэрсанальнай лаянкі, асабістага ахайваньня.

Дагэтуль ні адна, ні другая старана не паставіла як сьлед праблему аб сацыяльным значэньні літаратуры наогул, праблемы асобы (мастака) у прыватнасьці. А праблема стылю і формы ці яна не зьяўляецца актуальнай для маладой беларускай літаратуры?

Пытаньні тэматыкі, моватворчасьці, урэшце праблема канструкцыі, тэхналёгіі твораў—ці ўсе гэтыя праблёмы не зьяўляюцца актуальнымі? Чаму нашым крытыкам ня кінуць лаянку і не заняцца гэтымі праблемамі.

У першай частцы паэмы «Кругі» [1]), якая мае пакуль што характар крытычнага памфлету, Ул. Дубоўка ставіць некаторыя з гэтых праблем (гл. ліст Насты Нарутавічанкі), але ставіць іх па-свойму.

Дубоўка вельмі наздаволен нашай крытыкай, для Дубоўкі яна

«Нагадвае туман у цёмным лесе».

Што ў нашай крытыцы ёсьць многа недарэчнасьцяй, што яна не заўсёды сталая—наконт гэтага ніхто не спрачаецца.

Нас цікавіць, што наогул не падабаецца Дубоўды нават і ў сталай крытыцы. Аб тым, што іменна не падабаецца, скардзіцца паэту Нарутавічанка.

«Напішуць, добра ўсё, у самы раз,
А заўтра: брак настрояў пралетарскіх.
Ня крытыка, а нейкі самавар,
Усё залежыць ад старонняй ласкі».

У Дубоўкі перакананьне, што «Крытыка гуляе ў «лішкуцотку»
Замкнула аб'ектыўнасьць на замок,
І задаволена на сто адсоткаў».

Адгэтуль два палажэньні, якія высоўваюцца ў цьверджаньнях Ул. Дубоўкі,—першае, патрэбна поўная аб'ектыўнасьць аўтара да ўсяго таго, што ён малюе, і другое—патрэбен аб'ектывізм ў крытыцы.

Ні першае, ні другое з палажэньняў Дубоўкі не адпавядаюць задачам пралетарскай літаратуры, задачам марксысцкай крытыкі.

«Рабочы-пісьменьнік, кажа т. Беркоўскі Н., ня толькі дэманстрыруе людзей і быт,—ён яшчэ і судзіць, падае голас за або супроць. Бязвольная імітацыя сучаснасьці ня можа яго здаволіць. Ён павінен класьці на людзей і іх асяродзьдзе ацэначнае фарбы» [2]). І такой літаратуры, а таксама і такіх пісьменьнікаў, якія-б пісалі аб'ектыўна, бесстаронна, без сваёй уласнай ацэнкі людзей і іх асяродзьдзя, у гісторыі літаратуры ня было і няма.

Размова можа ісьці аб якасьці гэтай ацэнкі—апошняя залежыць ад таго, да якое клясы належыць паэта, або празаік: адна ацэнка людзей і іх асяродзьдзя ў Пушчы і іншая ацэнка ў пісьменьніка-пралетара.

Цяпер наконт аб'ектывізму ў крытыцы.

Аб тым, якой павінна быць марксысцкая крытыка, аб тым, ці яна можа быць «аб'ектыўнай», выразна гаворыцца ў рэзалюцыі ЦК УсеКП(б) аб палітыцы партыі ў дзядзіне мастацкай літаратуры: «Ни на минуту не сдавая позиций коммунизма, не отступая ни на пяду от пролетарской идеологии, вскрывая об'ективный классовый характер различных литературных произведений, коммунистическая критика должна беспощадно бороться против контр-революционных проявлений в литературе, раскрывать сменовеховский либерализм и т. д., в то же время, обнаруживать величайший такт, осторожность, терпимост по отношению ко всем тем литературным прослойкам, корые могут пойти с пролетарыатом и пойдут с ним».

Вось якія задачы паставіла партыя перад марксысцкай крытыкай—няшчадна змагацца супроць контр-рэвалюцыйных зьявішч у літаратуры, а разам выяўляць найвялікшы такт, асьцярожнасьць, цярпімасьць да тых, што могуць пайсьці з пралетарыятам і пойдуць з ім.

Тут, як бачыце, вельмі далёка да аб'ектывізму ў крытыцы. Але калі мы адхіляем аб'ектывізм, інакш кажучы, нэйтральнасьць і ў пісьменьніка, і ў крытыка, дык гэта ня значыць, што мы гаворым пісьменьніку: «Хоць памры, а давай пралетарскія настроі». У той-жа рэзалюцыі ЦК гаворыць, што мы ні ў якім разе не павінны вытраўляць з творчасьці сялянскіх літаратурна-мастацкіх вобразаў, якія зьяўляюцца неабходнай прадпасылкай для ўплываў на сялянства. Гэта адно.

Другое, што я хачу адзначыць, дык гэта ўпрашчэнства, якое Дубоўка хоча сілком уціснуць у марксысцкую крытыку. Атрымліваецца, што нібы крытыка патрабуе—дай настроі (пралетарскія), дай агітку, а там, што да формы, мастацкай якасьці самога твору—хоць трава не расьці. Каб мы разважалі так, як думае аб нас Дубоўка, дык мы павінны былі-б «Калектыў Яўмэна» А. Мрыя [3]) прызнаць за найвышэйшы абразец мастацкага твору, у гэтым творы пралетарскіх настрояў колькі хочаш.

Не скажу, што такія рэчы, як «Калектыў Яўмэна», нам непатрэбны. Яны патрэбны, як агітка, як агітацыйны плякат. Але ці здавальняе нас «Калектыў Яўмэна» як мастацкі твор? Мы рашуча кажам, не. Чаму? Таму, што А. Мрый паказаў нам ня жывога Яўмэна, будаўніка новай вёскі, а Яўмэна «хадульнага», паказаў «Ціта», а не «Яўмэна». Пралетарскіх настрояў колькі хочаш—аднаго брак—мастацкага афарміленьня. І таму апавяданьне не дзе чытачу «эмацыяльнага запалу».

Зусім другое мы бачым у «Спатканьні» [4]) К. Чорнага. Перад намі вёска—«не худальная» Мрыеўская вёска, а такая, дзе: «Новым зрубам бялела здалёк студня. Яшчэ пахла ральля і зьедзеная жывёлай да самых карэньняў паплаўная асеньняя трава». Ды і гэраіня апавяданьня,—аўтар яе нават не называе,—а ўсё-ж яна стаіць як жывая перад вачыма. Вось як Чорны малюе партрэт жанчыны:

«Яна на выгляд была старэйшаю за брата. Сялянская задумёнасьць, заклапочанасьць была ўва ўсёй яе постаці. Яна моцна пазяхнула, паправіла на галаве валасы, і ўсё яшчэ неяк устрывожана ціха гаворачы з братам, пачала мыць бульбу ў вялізным дзеравяным вядры».

У «Яўмэна» а ні воднае жывое рыскі,—а Кузьма Чорны сваім «паправіла на галаве валасы, моцна пазяхнула»—даў нам жывую постаць кабеты.

Не агітуючы (груба) К. Чорны мастацкі падае нам і новы быт. Кабета разьвязалася з сваім піяк гаспадаром: ёй прырэзалі зямлі ад панскага маёнтку, пад вясну думае каня перамяніць, «бо стары, дрэнна робіць. Таксама дапамогі папрашу,—рассказвае кабета брату,—мусіць дадуць мне, як удаве».

Аўтар не зьяўляецца бесстароннім да таго, што ён малюе, скрозь усё яго апавяданьне назіраеш яго спачуваньне кабеце, якая рве з старым бытам і выходзіць на новы шлях жыцьця.

Паданыя два апавяданьні паказваюць беспадстаўнасьць закідаў Ул. Дубоўкі, што наша крытыка толькі і патрабуе «настрояў пралетарскіх». Разам з гэтым мы хочам адзначыць, што прынцып нэйтральнасьці мастака, прынцып аб'ектывізму крытыкі, старонньнікам якога зьяўляецца Ул. Дубоўка, вядзе ў лепшым разе да лёзунгу «мастацтва для мастацтва», што роўназначна адмаўленьню сучаснасьці, у горшым выпадку ён вядзе да выяўленьня такіх настрояў, якія зьяўляюцца варожымі пралетарыяту і таму ладу, што ім устаноўлен.

Задача пісьменьніка даць адбітак жывога жыцьця і даць такі яго малюнак, які-б ня быў крывым люстэркам гэтага жыцьця; даць гэты малюнак у мастацкай форме; даць нам ня схэму чалавека, не хадульную асобу, а жывых людзей; задача мастака схапіць рыскі новага чалавека, які выхоўваецца ўжо новай эпохай, на новых няведамых раней клясавых узаемаадносінах, сынтэзаваць гэтыя рыскі і паказаць нам тып гэтага новага чалавека. Задача крытыка раскрыць твар пісьменьніка—раскрыць яго ідэалёгічны зьмест, папершае, і, падругое, паказаць, наколькі гэтаму зьместу адпавядае мастацкае афарміленьне твору,—зразумела, што ў гэтым аналізе крытык карыстаецца сваім клясавым скальпэлем—матэрыялістычна-дыялектычным мэтадам.

Чаго пехапае і беларускім крытыкам і большай частцы беларускіх пісьменьнікаў—гэта сур'ёзных адносін да тых праблем, што стаяць перад беларускай літаратурай.

Апроч задач, аб якіх я заўважыў у пачатку артыкулу, перад намі стаіць адна з асноўных задач—задача сувязі з масамі, сувязі пісьменьніка з чытачом. Я ня памятую выпадку выступленьня нашых паэтаў, пісьменьнікаў на заводзе, у заводзкім клюбе. А там, сярод рабочых мы-б знайшлі пядрэнных крытыкаў нашай творчасьці. Мы варымся ў сваім уласным саку, мы адгарадзілі парнас калючым дротам ад працоўнай масы.

Можа той пэрыяд абвостранай барацьбы, што вылівалася часта ў лаянку, аб'ектыўна быў і патрэбен. Час перайці да сталай, сур'ёзнай працы, да вырашэньня асноўных літаратурных праблем, для стварэньня сапраўднай пралетарскай літаратуры.

Джугар.

[1]) Гл. Узвышша № 5.

[2]) „На лит. посту" № 24—Стилевые проблемы пролетарской прозы,

[3]) Узвышша, № 5.

[4]) Ibidem.

БІБЛІЯГРАФІЯ

Тарас Гушча—Якуб Колас. „У глыбі Палесься". Аповесьць. Бел. Дзярж. Выдавецтва. Менск, 1927 г., цана 1 р. 60 к., 201 стар.

Кніжка „У глыбі Палесься" зьяўляецца працягам аповесьці „У Палескай глушы". Па кампазыцыі—„У глыбі Палесься" ёсьць асобная аповесьць. З старых знаёмых у новай кніжцы мы сустракаем толькі настаўніка Лабановіча, ды сям-там імя Ядвісі, якая ўстае ў памяці закахаванага настаўніка. Усе іншыя дзейныя асобы—новыя. Твор адбівае эпоху перадрэвалюцыі і захоплівае рэвалюцыю 1905 году.

На фоне сялянскага жыцьця разгортваецца драма маладога настаўніка. Настаўнік найлепш сябе адчувае ў грамадзе сялян: цёплыя, простыя адносіны і ўзаемная пашана. Аднак, для сялян ён ужо ня зусім свой, на яго глядзяць, як на чаніча. Нават родная матка і дзядзька яго выдзялялі. „І як ён (Лабановіч) ні стараўся сьцерці ўсякія граніцы паміж сабою і роднымі і цалкам зьліцца з імі, жыць так, як жывуць яны, яму гэта ніяк не ўдавалася".

Лабановіч бачыў цэмру і некультурнасьць сялян, хацеў ім дапамагчы дарадамі і сваёю непасрэднаю працаю. У маладой галаве раліся думкі: асушыць балоты, угнаіць поле гатовым гноем з балота, направіць грамадзкую грэблю, на якой „свасьці ламалі і жывёлу калечылі". Тая грэбля была „бяда і гора мікуліцкае". „Покі праедзеш—духі вытрасем і кішкі абоўташ". У адказ на заклік настаўніка сяляне толькі трэсьлі галовамі: добра было-б, але-ж „рады ня можам даць".

Значыць, у сялян ня было сьвядомасьці, ня было грамадзкіх навыкаў; яны былі выхаваны пад бізуном, „ня прывыклі выступаць грамадою", і „няўмелі даніць сваіх грамадзкіх інтарэсаў".

На грамадзка-культурным будаўніцтве Лабановіч папярэдуе няўдачу; аднак, не адступіў перад пяжкасьцямі: „Што ня ўдалося падняць сялян... то гэта ня значыць яшчэ, што іх наогул не падымем і падымаць ня трэба: не падняў цяпер, падымеш потым... Народ мала культурны, кансэрватыўны... Трэба гэта таварыць, будзіць яго, катурхаць. І, памойму, гэта ёсьць наш абавязак"—кажа Лабановіч свайму таварышу па школе і на працы.

У аповесьці, аднак, ня відаць, што ім удалося раскатурхаць сялян і перамагчы вясковую цэмру. Толькі ў другой аповесьці („На прасторах жыцьця"), ужо пры савецкай грамадзкасьці, выступае малады рабфакавец Сьцепан Барута, сын Кастрычніку, якому ўдалося аб'яднаць вясковую моладзь і асушыць тое балота. Толькі Барута з таварышамі яраз 17-20 год пасьля Лабановіча ажыцьцяўляе тое, аб чым марыў, гаварыў, за што агітаваў Лабановіч.

У аповесьці паказан падзел сялян на кулакоў з старшынёю на чале і бедноту. Лабановіч—з беднякамі. Ён разбураў іх веру ў цара, даводзіў, што цар—той-жа памешчык. Бядняк Аксён Каль жытныстры, бунтар і рэвалюцыянэр, вучыўся ў Лабановіча чытаць і пісаць і адначасова ўважліва слухаў лекцыі пазітівісьменнасьці—правільней—рэпісьменнасьці, на якія пераходзіў настаўнік пасьля кожнай лекцыі, пасьля чытаньня і пісьма. Сяляне ў часе рэвалюцыі зразумелі, што Лабановіч з імі, і сход, дзе абгаворвалі свае рэвалюцыйныя планы, зрабілі ня ў воласьці, а ў школе, «бо настаўнік—наш чалавек», а валасны пісар і старшыня—«басякі». «Нажываюцца толькі ўмеюць нашым потам»,—крычалі сяляне. І напісаная Лабановічам „пятыцыя"—ультыматум пану Скірмунту, сходам была прынята аднагалосна.

Аднак, рэвалюцыі, сапраўдных бунтаў і распраў з панамі Колас не паказаў. Ён даў маленькі агульны малюнак гэтае грандыёзнае сацыяльнае барацьбы.

«Грозная хваля зямельных бунтаў пакацілася на неасяжных прасторах царскае Расіі..., пакацілася бляскам пажараў, клубамі дыму, афарбоўваючы ў крывавы колер халоднае асеньняе неба... гудзе-ідзе пястрыманым поступам, разбураючы ўсё на сваёй дарозе».

Сяляне, якіх нам паказаў пісьменьнік, якімі ідэёва кіраваў Лабановіч, абмежаваліся пятыцыяй і захопам тоняў, аднятых (адсуджаных) некалі ў іх панам,

Аповесьць канчаецца налётам казакаў на сялян, якія сваявольна лавілі рыбу ў панскіх тонях, і арыштам разам з імі Лабановіча, як рэвалюцыянэра.

Апрача сялян і рэвалюцыянэраў у творы выведзены яшчэ настаўнікі, папы розных поглядаў і характараў, дзяк, валасны пісары, фельчар, лясьнічы, старшыня, стараста. Усе яны — мяшчане; п'юць, граюць у карты; нічога высокага і ідэйнага за іх душою няма. „Я бачу,—кажа ім няпрызнаны правіцыяльны філёзаф, яўрэй Бэхбэрг,—трупныя цені на вашых тварах". „Далёка адыйшліся вы ад законаў разумнага жыцьця". Амаль усе вясковыя інтэлігенты, сьвецкія і духоўныя, «Гэрої зялёнага поля», карцёжнікі, плеткары, распусьнікі, ханжы, нават шпіёны і даносчыкі (дзяк). На гэтым цёмным фоне вырысоўваецца вялізная трагічная фігура няпрызнанага паэты і філёзафа, старога яўрэя Бэхбэрга. Ён адчувае і бачыць хараство і мудрасьць прыроды, бічуе мяшчанскае балота, выдае рукапісную газэту «Панямонскія Ведамасьці», добра ведае быт і, здаецца, бачыць патрэбы мясцовага насельніцтва, адкрыта, часна, сьмела разбурае забабоны і рэлігійную «экамянеласьць» сваёй нацыі, за свае пераконаньні і ідэі нясе пакуту, а ад іх не адмаўляецца. Над ім кпілі—«у яго ня ўсе былі дома». Часамі кпіць над ім і Якуб Колас, але, здаецца, іншы раз бачыць і памятуе ў ім самога сябе.

Кампазыцыя аповесьці вельмі простая, нават аднастайная. Лабановіч пераяжджае, вандруе, сустракаецца з рознымі людзьмі, а Колас іх апісвае і характарызуе. Асобы, якіх выведзена надта многа, зьяўляюцца на момант, знаёмяцца, а потым разьвітваюцца з Лабановічам і сходзяць са сцэны, каб больш ніколі ўжо не зьявіцца. Адзін Лабановіч ня зьнікае на працягу ўсяе аповесьці. Лабановіч то захапляецца хараством прыроды, прастатою і мудрасьцю сялян, то сумуе аб іх і сваёй долі-нядолі, а Колас дае прыгожыя малюнкі беларускае прыроды, вядзе разважі на філёзофскія і сацыяльныя тэмы, робіць высокія ўзьлёты. Малюнкі прыроды і быту Коласу, як заўсёды, даюцца дасканала. Кампазыцыя характарыстык асоб такая, што перш апісаньне надворнага выгляду, потым паказ псыхалёгічнага твару; Колас глыбока, пераконваючы, мастацкі расказвае, што адчувае, думае, перажывае кожная чынная яго асоба. Лабановіч асабліва добра выяўлен аўтарам.

Вось кніга, якая будзе мець вялікі посьпех у нашай камсамольскай моладзі, у настаўніцтва, вясковага культурніка.

В. Сокал.

На 6-га лютага г. г. у Менску склікаецца Ўсебеларуская канфэрэнцыя аб'яднаньня паэтаў і пісьменьнікаў

„МАЛАДНЯК"

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:

1. Інфармацыя аб становішчы ў „Маладняку".
2. Сучаснае становішча беларускай літаратуры і месца ў ёй „Маладняка".
3. Аб расійскай літаратуры і працы ВАПП'у.
4. Сучасная украінская літаратура і літаратурныя групоўкі на Украіне.
5. Выбары кіруючых органаў.

Арганізацыйная камісія.

Сяргей Дарожны

З песень аб вёсцы

1.

Сьціхла бура,
Замоўкла Палесьсе,
Белы сьнег паразьмятала скрозь.
Зноўку роднае бачу залесьсе
І сяло,
Дзе калісьці узрос.
Так даўно
Гэта ўсё прамінула,
Колькі год маладых, колькі зім...
Хаты нізкія к долу прыгнула,
Стрэхі вецер
На бок пакасіў.
Думы ціхія
Голаў схілілі...
Тых суседзяй даўно ўжо няма.
Дзед, што колісь тут жыў—
У магіле,
Бацьку-ж песьняй адпела
Зіма.
Як зьмянілася
У вёсцы багата,
Ты глядзіш і ня верыш сабе:
Сталі радам пасёлкавы хаты
І у гурбах сьняжыстая бель.

2.

Вось іду я
Знаёмай лагчынай,
Тут калісьці год пяць назад
Красавалі, шумелі асіны,
А цяпер—роўна саджаны сад.

Тая-ж царкаўка,
Могілкі водаль,
Стараною шырокі плес.
Праяжджаюць пустыя падводы
На лясныя работы
У лес.

Усё знаёмае
Голаў нітуе.
Учора весьці прынёс паштавік
І газэты,
І літаратуру
За апошнія самыя дні.

У чытальню іду.
Вечар, зімна,
Цень ад кожнага аганька...
Праглядаю ў газэтах навіны,
Тэлеграмы, адчот ЦВК.

А ў сяле
Звонка сыплюцца песьні:
Новы год.
Засьвяцілі агні...
Белы сьнег за сярэбраным лесам,
Як-жа весела ў зімнія дні.

15/I—28 г. Лясковічы.

С. Шушкевіч

ПРЫЙДЗЕ ЧАС...

Прысьвячаю Б. Сідаркевічу.

Асьвячае шлях для нас адна паходня.
Мэта ў нас таксама ёсьць адна...
Ты прыйшоў з пакрыўджанай Заходняй
Я-ж таксама з панства бізуна.
І цяпер, калі халодны вецер
Засыпае сьнегам нам вакно,
Успаміны, быццам дрэва вецьце,
Нахіляюць сумнае чало.
Вёска... Беднасьць... Згніўшая валома
На старой прыгорбленай страсе.
Двор закіданы струхнелым ломам,
Апусьцелы ў сьвіране засек.
Плот паломаны, скрыпучыя вароты,
Крык дзіцячы, шум гарбатых верб.
Бацька йдзе падзённа на работу,
Быццам бачу я яго цяпер.
Часты стук бліскучых карабінаў.
Часам моцны праразьлівы плач.
За нядоімку апошнюю скацінну
Гоняць з крыкам вуліцай падчас.
Асьвячае шлях для нас адна паходня.
Мэта ў нас таксама ёсьць адна...
Прыйдзе час: над нашаю Заходняй
Расьцьвіце Усходняя Зара.

МІХАСЬ БАГУН

ПАМЯЦІ ВЯЛІКАГА

Адцьвіўшымі краскамі нікнуць гады,
Рубцамі на сэрца кладуцца...
Халоднымі хвалямі бурнай вады,
Трывожнымі песьнямі ўюцца...

Гублялі мы многа адважных байцоў—
Сачыліся сэрцы крывёю,
Калі засыпалі мы лепшых братоў
Халоднай магільнай зямлёю...

Ахопліваў сэрцы жаль, горкі, як дым,
Ды ўсёткі ня так, як сягоньня
—Сягоньня Вялікі скананў Правадыр,
Згараў у бліскавічным разгоне...

Жыцьцё анямела. І жудасны жах
Прарэзаў у сэрцах дарогу...
А вестка—удары стальнога нажа—
Шалёны рассыпала скогат:

— Ня верым! Вялікі ў вялікіх жыве!
— Ня верым! Ня верым! Ня-ве-рым!
І стогне жальбою прыкушаны сьвет
Шалёна разгневаным зьверам...

І толькі няўхільна гудзяць правады,
Надзеі апошнія гоняць:
Сягоньня Вялікі скананў Правадыр
Сягоньня! Сягоньня! Сягоньня!

Рассыпала чорныя пацеркі сьмерць,
У вочы дыхнула марозам—
Ня хочаш нам верыць, Таварыш, павер
Ў сэрцах ускіпаючым сьлёзам...

І ўсёткі... Ня трэба, каб сьлёзы цяклі.
Ўзмацняйма калёны бяз лені!
Сягоньня памёр наш Вялікі Ільліч
Змагар за пакрыўджаных—**ЛЕНІН!**

Які нам патрэбен кіно-фільм

ВЯЛІКІ ДЫСПУТ АБ КІНО

На гэтым тыдні рэдакцыяй газэты «Чырвоная Зьмена», клюбам «КІМ» і цэнтральнай сэкцыяй кінаработнікаў быў арганізаваны вялікі дыспут працоўнай моладзі гораду Менску на тэму—«Які нам патрэбен кіно-фільм». Вялікае памяшканьне кіно-тэатру «Культура» не магло ўмясьціць усіх жадаючых.

Адчыняючы дыспут рэдактар газэты «Чырвоная Зьмена» тав. Курцік застанавіўся на тэй вялікай ролі, якую ўскладае камуністычная партыя на кіно.—А ці выконвае поўнасьцю наша кіно гэту роль?—пытаецца прамоўца і адказвае:

—У большай частцы кіно-фільмы, якія паказваюцца ў нашых кіно-тэатрах, не задавальняюць рабочага глядача. Усе кіно-стужкі савецкага вырабу ў абавязковым парадку паказваюць гніль буржуазіі. Значная частка савецкіх фільмаў «смакуюць» палавыя пытаньні.

Тав. Галкін бярэ ўступнае слова і дае сваё тлумачэньне пытаньню, які мы кіно-фільм лічым добрым.

—Перш за ўсе той, у якім няма непатрэбнага суму, які актуальнасьцю зьместу хвалюе глядача.

Паведаміўшы, што ў СССР амаль зусім ня будуць прывозіцца замежныя кіно-фільмы, тав. Галкін коратка спыніўся на працы Белдзяржкіно.

Аб зусім няўдалай і пахабнай кіно-стужцы «Прастытутка», якую выпусьціла Белдзяржкіно, прамоўца чамусьці нічога не сказаў.

Па думцы тав. Галкіна нам патрэбны зараз добры бытавы фільм і вясёлая, здаровая савецкая камэдыя.

З самага пачатку дыспуту, прэзыдыум закідалі пісулькамі з просьбаю даць слова. Выступала штам маладых рабочых, якія выкрывалі сваё незадаваленьне кіно-стужкамі.

Вясковы хлапец з Барысаўскага раёну тав. Хадасэвіч скардзіўся на Белдзяржкіно за тое, што яно прысылае ў вёску такія кіно-стужкі, якія апрача п'янства, зладзейства, хуліганства і палавой распутнасьці больш нічога не паказваюць, нічому карыснаму не навучаюць.

Тав. Хэйфэц (клюб «КІМ») выказвае думку, што для рабочай моладзі неабходна вытворчая кіно-стужка.

Маладая работніца тав. Блох кажа, што рабочы глядач яшчэ пазбаўлен такой маленькай магчымасьці, як пасьмяяцца ў ахвоту на добрай кіно-камэдыі.

Многія таварышы казалі аб тым, што рабочы глядач з ахвотаю ідзе ў кіно, калі паказваецца рэч з клясычнай літаратуры.

На дыспуце выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Кнорын. Яго прамова была спаткана дружнай працяжнай авацыяй. У сьціслых рысах тав. Кнорын падкрэсьліў:

— У сучасны момант пытаньні барацьбы за новую культуру набываюць вельмі і вельмі вялікае значэньне. Перад намі паўстаюць задачы—як зьнішчыць наш стары быт, як пабудаваць новы.

У справе культурнай рэвалюцыі кіно павінна адыграць вялікую ролю. З усіх кіно-фільмаў, што выпушчаны савецкімі кіно-арганізацыямі, толькі 20-30 процантаў нас больш-менш задавальняюць. Рэшта культывуе дрэнныя, пахабныя прыёмы буржуазнага кіно. Тут многія таварышы скардзіліся, што іх кіно не задавальняе, патрабавалі лепшых кіно-стужак. Зусім правільна. Калі-ж мы будзем мець добрую кіно-фільму?—Толькі тады, калі нашы арганізацыі кіно-справы ня будуць адарваны ад шырокіх працоўных мас. А гэтыя арганізацыі ня будуць адарваны ад мас толькі тады, калі дыспуты, падобныя сёньняшнім, будуць не выпадковымі.

Часам для кіно-фільмы бяруць вельмі адцягнутыя тэмы, падаюць іх занадта «вучона» і яны праходзяць міма глядача. Асноўнае, у нас няма кіно-стужкі, якая-б поўнасьцю адбівала сёньняшні дзень, а таксама тую гэроіку, якую праяўляе рабочая кляса на будаўнічым фронце.

Мы патрабуем і яшчэ больш будзем патрабаваць ад кіно-арганізацый такіх кіно-стужак, гледзячы якія мы адначывалі-б і навучаліся-б працаваць у заўтрашні дзень.

Сваю прамову тав. Кнорын скончыў пад авацыю ўсёй залі наступным заклікам да рабочай моладзі:

— У нас ёсьць некалькі рэкордных кіно-стужак. З намі не зраўнялася ні адна буржуазная кіно-арганізацыя. Але ў нас вельмі шмат буржуазнай, гнілой «мішуры». Камсамольскі друк, арганізаваны малады рабочы глядач! Штурмуйце, крытыкуйце, крычэце, рэжце, грамеце дрэнныя кіно-стужкі і гэтым вы дапаможаце кіно-арганізацыям стварыць добры савецкі фільм!

Кіно павінна быць сродкам палітычнай агітацыі камуністычнай прапаганды і асьветы. Добрыя кіно-стужкі зьнішчаць п'янства і хуліганства, цэмру і некультурнасьць. Праз кіно трэба прыцягваць шырокія масы сялянства да актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. Кіно павінна поўнасьцю адбіць сёньняшні дзень. Аб гэтым гаварылі тав. Галавач (ЦК ЛКСМБ), тав. Кацнэльсон (Белдзяржкіно), народны камісар асьветы тав. Баліцкі і шэраг другіх таварышоў.

Пасьля кароценькага заключнага слова тав. Галкіна была прынята прапанова, каб увесь матар'ял дыспуту пераслаць у ЦК УсеКП(б) для скарыстаньня кіно-парадай, якая адбудзецца ў сакавіку месяцы.

Зьм. Паваротны.

СЯБРОЎСКІ ШАРЖ

ЗЬМІТРОК БЯДУЛЯ

На сходзе ўдзячных чытачоў першае беларускае ілюстраванае дзіцячае газэты „Качачка-цацачка".

ЮРКА ЛЯВОННЫ

У той дзень

Як заўсёды
гналіся хвіліны,
Цягнікі ляцелі
на парах.
Але раптам,
нечаканай стыньню,
Ў сэрца вестку
ўклініў тэлеграф:
...У белым доме,
за Масквой прапетай,
Што ў сасновым,
бронзавым бары.
Памёр Ленін—
правадыр сусьвету,
Адыйшоў маўкліва,
на зары.
І туга
на час язык зьвязала,
І ў мацнейшых—
на чале равы...

На стале.
паміж калёнаў залы,
У труне ляжыць ён,
няжывы..

Адцьвітае сонечная рань...
Памірае ўсё...
Закон прыроды!
Але ўзьлётаў духу,
думак грань
Не зламіць
гадам і перашкодам!

Ў творчай працы
буйных пакаленьняў
Шлях Ільліч
паказвае для нас
І заўсёды будзе
імя „Ленін"
Сымбалем змаганьня
дзеля мас!..

Легіянэры

(З грамадзянскае вайны)

Маленькая, абвітая высмяюючым вінаградам і абклееная рознакаляровымі плякатамі станцыя.

На засыпанай шалухою ад сланечнікаў плятформе ходзяць сумныя людзі.

Супроць стацыі ўрос у рэйкі доўгі цягнік без паравозу з гірляндамі цярнялівых пасажыраў на страхах.

Цягнік—з палонными легіянэрамі, абшарпанымі, у блакітных шапках-канфэдэратках.

Каля вагонаў—групка: пара чырвонаармейцаў, высокі з вялікімі вачыма грузін, чыгуначнік, вымазаны аліваю і заліхвацкі матрос. Матрос сьпіце лаянкаю.

— Бач, расцярпаны, яйка і млека захацелі... ня прывыклі да хлеба?

Палонныя зьбянтэжаны.

— Але мы,—заганарылі палонныя,—совсем не хацем ваёваць.

— Ня хочаце, а ваюеце... на пралетара вайною ідзеце.

—У іх,—сказаў чыгуначнік,—краіна капітальная, што ні слова,—дык нам,—панская краіна, а беднаму чалавеку ня дыхнуць.

Палонныя ўсьміхнуліся.

— Гэта мы разумем. У нас юж тры месяцы ў Варшаве о-ого-го!

— Рэвалюцыя?—настаражыўшыся запытаў чыгуначнік.

— Но так, але-ж ня можна вшыстко адразу... жэ хто буржуй, жэ піе крэв... жэ о... ого-го.

— Разумеюць,—з радасным зьдзіўленьнем павярнуўся ў бок чырвонаармеец,—чуюць вы, скінулі-б сваіх панаў.

— А що... о... ого-го!

— Куды там!—павяселелі тыя, што стаялі ля вагонаў—сапраўдныя бальшавікі.

— Э-о,—забасіў з вялікімі вачыма грузін—тая плян прышла, тая ведае тэрнацыянал?

— Не,—заківалі галовамі палонныя, у нас сьцявасм: „Яшчэ польска ня згінэла".

Гэта не тэрнацыянал... тэрнацыянал плям: „Гэта будэт наследнім... мы не пнем гэта будэт, мы пасем—гэта ест... эта ест наследны вайна. Мыр патрэбны. Для вас мыр... што-б нарэшце быў ужо канец, зразумеў, крычы «ура».

Усе і палякі крычалі „ура".

А. К.

ГОД ЛЕНІНСКАГА ІНСТЫТУТУ

Ураджай 190 пуд. жыта на балоце.—Геафізычная абсэрваторыя ў Менску.—Беларускі кліматычны атлас.—473 сялян-вопытнікаў.—Арганізацыя новых станцый і лябараторый

У БССР у 14 раз больш дасьледчых станцый, чым у даваенны час

У зьвязку з выкананьнем гадавіны з дня адчыненьня дасьледчага інстытуту сельскай гаспадаркі імя Леніна наш супрацоўнік меў гутарку з дырэктарам інстытуту т. Гарэцкім, які падзяліўся дасягненьнямі працы інстытуту за гэты год.

— Інстытут,—кажа т. Гарэцкі, працаваў у мінулым годзе ў складзе трох аддзелаў: аддзелу с.-г. эканомікі і аграрнай палітыкі, мэліярацыі і культуры балот і лясной гаспадаркі. З кастрычніка 1927 г. арганізаваны два новыя аддзелы: жывёлагадоўлі і расьлінаводзтва.

Аддзел с.-г. эканомікі правёў экспэдыцыю па эканоміцы мэліярацыі. Сабрана звыш 7.000 падворных апісаньняў сялянскіх гаспадарак і звыш 200 бюджэтных апісаньняў. Праведзены экспэдыцыі па вывучэньні форм земляўпарадкаваньня (каля 1.000 падворак і 100 бюджэтак), па вывучэньні эканомікі ільнаводзтва, эканомікі Мазырскага Палесься і па вывучэньні рыпачных умоў сьвінаводзтва б. Слуцкай акругі.

Распрацоўваюцца матар'ялы экспэдыцыі мінулага году па вывучэньні эканамічнага профілю БССР да 54° (5.500 падворак і 350 бюджэтак); вядзецца вывучэньне народнай гаспадаркі Заходняй Беларусі.

Аддзелам эканомікі сельскай гаспадаркі арганізаваны ў 70 сялянскіх гаспадарках рахункаводчыя апісы. Гэтым пакладзена падстава бухгальтэрыі сельскай гаспадаркі, бяз чаго немагчымы падлік прыбытковасьці асобных галін і гаспадаркі ў цэлым. Аддзел мае заяўкі ад звыш 50-ці гаспадароў аб добраахвотным уведзеньні рахункаводчых запісаў.

Па аддзеле мэліярацыі і культуры балот дасьледваньні вяліся па двух цыклях тэм.

Менская балотная станцыя дабілася магчымасьці атрымліваць з балотнай глебе ўраджаю жыта 110—190 п., ячменю і аўсу —120—170 пуд., бульбы—1.100 1.700 пуд. і траў—350—700 п.

Дырэктар Інстытуту тав. Г. Гарэцкі

У мэтах вывучэньня культуры балот у экстэнсыўных умовах аддзел арганізуе дасьледчую балотную базу ў Палесьсі на Мар'інскім калёнізацыйным фондзе.

Аддзел лясной гаспадаркі вывучае біялёгію лясных насаджэньняў і пароў драў Беларусі, робіць дасьледваньні ў галіне хэмічнай тэхналёгіі дрэва, падсочкі беларускай сасны і елкі ў мэтах атрыманьня смалы, жывіцы і каніфолі. Работа вялася пад непасрэднім кіраўніцтвам праф. Шкацелава. Акрамя таго аддзелам вядзецца вывучэньне сялянскіх хэмічных промыслаў (смалакурэньне).

Інстытуту перадана мэтэрэалёгічнае бюро ад Наркамзему. Інстытут рэарганізуе яго ў беларускую гэа-фізычную пасаду з пабудаваньнем у Менску геафізычнай абсэрваторыі. На арганізацыю абсэрваторыі Наркамфін СССР адпусьціў 40.000 рублёў.

Асаблівую ўвагу інстытут удзяляў арганізацыі сялян-дасьледчыкаў; гэтай рабоце ўдалося надаць у поўнай меры арганізаваную форму. Лік сялян-дасьледчыкаў узрос з 63 да 474.

У бліжэйшы час інстытутам будзе прыступлена да арганізацыі цэнтральнай дасьледчай сьвінаводчай станцыі і цэнтральнай станцыі бульбы. Ад усесаюзнага інстытуту прыкладное батанікі атрымана згода на супольную работу па станцыі бульбы, пры чым работа па генэтыцы бульбы будзе весьціся праф. Ячэўскім.

У 1927-28 г. будуць праведзены экспэдыцыі па вывучэньні сялянскай рагатай жывёлы і садаводзтва. Па некаторых галінах—сьвінаводзтве, мэліярацыі і культуры балот, бульбы інстытут прадугледжвае так разгарнуць працу, каб дасьледчыя ўстановы па гэтых галінах набылі ўсесаюзнае значэньне.

За мінулы год інстытутам выдана 8 назваў (38 друкаваных лістоў), акрамя таго выдан вялікі кліматычны атлас Беларусі пр. Кайгародавым. Інстытут арганізаваў цэнтральную хэмічную лябараторыю, буйную па разьмерах, і абсталяваную, што дае магчымасьць весьці складаныя хэмічныя дасьледчыя работы.

Важным момантам ў пасьпяховасьці працы інстытуту вяўляецца цесная сувязь з іншымі дасьледчымі ўстановамі ў Беларусі і сувязь з вытворчасьцю: з працаўнікамі Наркамзему, усімі зямельнымі работнікамі і, самае важнае сувязь з сялянствам праз інстытут сялян дасьледчыкаў. У мэтах сувязі з с.-г. спэцыялістымі інстытут выдае спэцыяльны орган «Сельская сялянская гаспадарка».

Лік дасьледчых станцый у БССР у 14 раз больш, чым ён быў у даваенны час.

Новая швэйная фабрыка

Прамплян ВСНГБ прызнаў мэтазгодным прыём пад ведама ВСНГБ працалектыву краўцоў у Гомелі з рэарганізацыяй яго ў фабрыку. Лік рабочых на фабрыцы будзе даведзены да 300 чалавек.

Разьмер гадавое вытворчасьці па фабрычна-заводзкім сабскошце па новай фабрыцы вызначаецца ў 2.400.000 рублёў. Для набыцьця абсталяваньня і рамонту пастаноўлена патраціць 30.000 рублёў. Адначасова вырашана прадставіць заяўку на сырэц на трэці квартал, улічваючы патрэбы гомельскай фабрыкі.

МЕНСК

Дапамога дзецям Заходняе Беларусі

Вечар на карысьць дзяцей рабочых і сялян

ЦК Беларускага Чырвонага Крыжу ладзіць разам з беларускімі пісьменьнікамі і артыстымі на панядзелак 23 студзеня 1928 г. у памяшканьні «Дом Культуры» вялікі вечар на карысьць дзяцей бяднейшых рабочых і сялян Заходняе Беларусі. Праграма вечара вельмі разнастайная і абяцае быць цікавай. З галоўных нумароў праграмы адзначым: „Чорт і баба", жарт у выкананьні артыстых БДТ-2, выступленьне з вершамі, прысьвечанымі Зах. Беларусі Ян. Купалы, Якуба Коласа, Цішкі Гартнага, Міхася Чарота; у канцэртнай частцы бяруць удзел Л. Александроўская, А. Бясьсьмертны, Навіцкі, Вастокаў, Пятроў, Станюта.

Білеты штодня можна купіць у ЦК Чырвонага Крыжу, у Інбелкульце, у магазыне Дзіцячай Камісіі і ў касе «Культуры».

* * *

У сувязі з недародам і іншымі навалами, якія былі за апошні час у Заходняй Беларусі Чырвоны Крыж вырашыў зрабіць дапамогу дзецям рабочых і сялян, якія пацярпелі ад гэтых навалаў.

У мінулым годзе на гэтую мэту было выдаткавана каля 5.000 руб.

Вечар, які ладзіцца ў Менску 23-га студзеня, павінен прыцягнуць увагу ўсёй савецкай грамадзкасьці, бо гэта зьяўляецца задачай дапамогі сваім братом, якія знаходзяцца за тым баку граніцы.

Прышчэпкі супроць шкарлятыны

Прышчэпкі супроць шкарлятыны вытвараліся атрадамі акр. аддзелу аховы здароўя арганізаванаму дзіцячаму насельніцтву (школы, сады і г. д). Усяго зроблена каля 14.000 прышчэпак.

Здарэньні

— Мэблі былого графа Чапскага. У доме № 13 па Чырвонаармейскай вул. да рэвалюцыі жыў былы граф Чапскі. Пасьля рэвалюцыі ён уцёк за граніцу, пакінуўшы каштоўную мэблю, якая была схавана жыхарамі дому, галоўным чынам, уласьнікамі яго Пружанскай і Мінкоўскай. Зараз Крымінальны Вышук гатую справу выкрыў. Па кватарах знойдзена мэбля былого графа Чапскага на некалькі тысяч рублёў. Пружынская і Мінкоўская прыцягваюцца да адказнасьці.

— За нядбайнасьць. У свой час у нас паведамлялася аб пажары ў калёніі „Расьсьвет". Пажарам быў вышчан млын коштам у 8.000 руб. Крымінальны Вышук за нядбайнасьць прыцягвае да адказнасьці загадчыка млыну Клімовіча, машыністага Баліна і зьняволенага Ракава.

— Затрыманьне хулігана. За хуліганства на Біржы працы першае аддзяленьне міліцыі затрымала М. Макоўскага.

— Бойка. У часе папойкі ў вёсцы Клінак, Чэрвенскага раёну, забіты Ц. Каток—36 год. Забойца затрыман.

— Затрыманьне злодзея. Крымінальны Вышук затрымаў злодзея І. Ясінскага, якога доўгі час шукаў Слуцкі нарсуд на крымінальнай справе.

— Пакража. У гр-кі Кавалёўскай у памяшканьні цэнтральнай аптэкі ўкрадзены з кішэні кашалёк з грашыма і аблігацыяй пазыкі індустрыялізацыі.

«СПОРТ»

Хто на першым месцы па індывідуальнай барацьбе

Па індывідуальнай барацьбе вага пера першае месца ўзяў Новікаў (клюб. кам.) і другое—Соскін (прафсаюз).

Па лягчэйшай ваге першае месца ўзяў Мяхавік (клюб) і другое—Каральковіч (прафсаюз), па лёгкай ваге на першым месцы ідзе Анціновіч (кл.) і па другім—Мецік (кл.), па сярэдняй ваге першае месца разьдзелена паміж Прыдачам (ваенвед) і Страдзе (Бар.), па паўцяжкай ваге на першым месцы—Катовіч (ваенвед).

Усебеларуская спартакіяда

23 студзеня ў Менску пачынаецца Усебеларуская спартакіяда. Будуць наладжаны спаборніцтвы: па лыжах, канькох, падняцьці цяжару, барацьбе і боксе. Спартакіяда працягнецца 7-8 дзён.

Паведамленьні

Менскі Гаррайком МОПР'у паведамляе ўсе ячэйкі Гарадзкога раёну, што гарканфэрэнцыя МОПР'у адбудзецца 4-га лютага г. г. Просім ячэйкі прыслаць усе пратаколы, весткі і сьпісы дэлегатаў, якія выбраны на канфэрэнцыю, не пазьней 28 студзеня г. г.

Пра месца, дзе адбудзецца канфэрэнцыя, будзе паведамлена асобна.

Гаррайком.

— 24-га студзеня а 8 гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу першай больніцы адбудзецца адкрыты агульны сход ячэйкі ЛКСМ медсанпрацы.

Запрашаецца беспартыйная моладзь саюзу медсанпрацы.

Дом Асьветы.

— У нядзелю, 22 студзеня, а 7-й гадзіне адбудзецца лекцыя дацэнта БДУ т. Тэпіна на тэму: „Мастацтва, кіно, школа". Уваход для ўсіх членаў саюзу вольны.

2-гі Усебеларускі зьезд яўрэяў-сялян

Член Камэту СССР т. Мержын зрабіў на зьезьдзе паведамленьне аб земляўпарадкаваньні яўрэяў у СССР і аб праекце перасяленьня іх у Сібір. Тав. Мержын кажа:

— Камэт СССР паставіў перад сабою задачу перавесьці 100.000 яўрэйскіх сем'яў на земляробчую працу. За апошнія тры гады мы на плошчы каля 1 мільёну дзесяцін зямлі. 10.000 сем'яў змогуць пасяліцца на зямлі, якая не патрабуе зусім мэліярацыі. Рэшту прыдзецца разьмяркаваць на зямлі, якая патрабуе ўсё-ж некаторых мэліярацыйных рабох. 15.000 сем'яў змогуць таксама арыентавацца на працу ў розных галінах прамысловасьці, якая тут павінна разгарнуцца дзякуючы наліччу вялізнае колькасьці мінэральных багацьцяў.

Прадстаўнікі Камэт'аў: 1) т. Фрыдман (Крым), 2) т. Мержын (ад Усесаюзнага), 3) т. Кантар (Украіна)

Мы думаем у працягу першых пяці год пасяліць там 10.000 сем'яў і стварыць кампактны яўрэйскі цэнтр.

Учора зьезд яўрэяў-сялян вітаді прадстаўнікі Усебеларускага зьезду дактароў.

Учора-ж увечары павінен быў адбыцца ў «Доме Культуры» вялікі мітынг, на якім т. Мержын зробіць інфармацыю аб перасяленьні яўрэяў у Крым.

Адказны рэдактар
Ян АСЬМОЎ.

СЕРТИФИКАТЫ
Государственных Трудовых Сберегательных Касс
ВЫПУЩЕНЫ ДОСТОИНСТВОМ
в 5 и 10 руб.
ЕЖЕДНЕВНО ПОВЫШАЮТСЯ В ЦЕНЕ
ДАЮТ 12% ГОДОВОГО ДОХОДА
Через шесть лет удваиваются в цене и стоят 10 р. и 20 р.
Сохраняют полную тайну сбережения
Свободны от всех налогов.
Сертификаты продаются и покупаются всеми сберегательными кассами.
Спросите сертификаты Государственных Трудовых Касс

Секаровская жидкость „Вытяжка из семенных желез"
Приготовленная по способу профессора Дра Бюхнера
Имеется в продаже во всех аптеках и магазинах санитарии и гигиены СССР
Почтой из главного склада высылается не менее 6-и флаконов при получении задатка 25%. Пересылка и упаковка за наш счет
Цена флакона 2 р.
Врачам для испытания по требованию высылается gratis
Москва ул. Герцена № 5
Заказы, письма и деньги адресовать: Лаборатория кооператива „Гален-Москва" тд. 10

ТЭАТР, КІНО

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр — НЯДЗЕЛЯ, 22 СТУДЗЕНЯ, „У МІНУЛЫ ЧАС", народная трагэдыя ў 4-х дзеях. Пачатак а 8 з палов. гадзіне.

Кіно-тэатр „Культура" — Грандыёзны мастацкі фільм „ТАКАЯ ЖЕНЩИНА" (Чужая). Звыш праграмы ХРОНІКА СОВКІНО 51-109.

Кіно „Тэатр-пыянол". — КОРЫНА БЕЛЬ у выд. фільме „Пылкая юность", у 7-мі част. Звыш праграм. гастр. артыста Маск. і Ленінгр. эстрады Е. А. МУРАТАВА, сатыра, юмар. апошнія навіны.

Кіно „Чырвоная Зорка". — Мастацкі фільм „НЕМОЙ ДРУГ", драма у 6 частках. Пачатак сэансаў а 6, 7 з палов., 9 і 10 з палов. г. увеч. Наступная праграма: „ВАРЬЕТЭ".

Кіно „Пралетары". — „Вторая жена". Пачатак сэансаў а 6, 7½, 9 і 10½ г. увеч. Каса—ад 6 гадз. увеч. Чарговая пастаноўка: „СУКА ДИПИУРЬЕРА"

Толькі 1 дзень — Кіно „Пралетары" — Панядзелак 23 студзеня

Грандыёзны мастацкі фільм
„ПРАЦЭС АБ 3-х МІЛЬЕНАХ"
пры ўдзеле ІГАРА ІЛЬІНСКАГА.
Звыш праграмы—вясёлая камэдыя:
„Находчивый поклонник"

ЗАОЧНЫЕ ПРОМЫШЛЕННО-ЭКОНОМИЧЕСКИЕ КУРСЫ
„ПОЛИГЛОТ"
(Основ. в 1917 г.)
состоящие в ведении С.-К. Крайкома.
ПРЕДМЕТЫ ПРЕПОДАВАНИЯ:
бухгалтерия, коммерческ. вычисл., торг. корреспонд., делопроизводство, землеустройство, техн.-худож. черчение, машиностроительное черчение, рисование, стенография и копирует (дефектуз).
Занятия посредством переписки по почте специально составленными лекциями, ВПОЛНЕ ЗАМЕНЯЮЩИМИ УСТНОЕ ПРЕПОДАВАНИЕ. По окончании курса учащиеся подвергаются испытанию в специальн. квалифик. комиссии и получают соответствующее СВИДЕТЕЛЬСТВО.
На 1-е ноября 1927 г. на курсах состоит свыше 15.000 учащихся.
Плата повсеместно от 1 до 3 рублей.
Требуйте бесплатно проспекты, программы и условия.
Адрес: Ростов на Дону „ПОЛИГЛОТ".

АБ'ЯВА.
Ад першага лютага 1928 году
будуць зьліквідаваны
ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАСА пры НКФ
і ПРЫХОДА-РАСХОДНАЯ КАСА пры Менскім АКРФА.
Усе казначэйская апэрацыі памянёных кас будуць вытвараццa
аб'яднанай казначэйскай часьцю НКФ
пры ўсебеларускай канторы Дзяржбанку.
Казначэйская часьць будзе зьмяшчацца
Ў ПЕРШЫМ ПАВЕРСЕ будынку Дзяржбанку
Наркамфін БССР.

ИЗДАТЕЛЬСТВО РЯЗАНСКОГО ГУБИСПОЛКОМА
„РАБОЧИЙ КЛИЧ" и „ДЕРЕВЕНСКАЯ ГАЗЕТА"
бромо-серебренная фотобумага „АСТРА" бромо-серебренная фотобумага
ГЛЯНЦЕВАЯ, МАТОВАЯ, ПОЛУМАТОВАЯ.
Масса отзывов говорят за то, что качественно бумага „АСТРА" не уступает некоторым сортам заграничных бумаг.
Фотографическая консультация журнала „Советское Фото" после испытания бумаги „АСТРА" в своем заключении указывает, что градация тонов отпечатка, с нормально-проработанного негатива, вполне удовлетворительна; время проявления нормальное; степень закубленности эмульсии—нормальна; пузырей при фиксировании и промывке не наблюдалось; сползания слоя нет.
ПОЛИВКА ПРОИЗВОДИТСЯ МАШИННЫМ СПОСОБОМ.
На губ. выставке АХРР'а фото-лаборатория „АСТРА" получила похвальный отзыв за громадные достижения в качестве фотобумаги „АСТРА".

Розничн. цены:	
5 на 9	35 к.
9 на 12	65 „
10 на 15	90 „
13 на 18	1 40 „
18 на 24	2 60 „
24 на 30	4 30 „
30 на 40	7 20 „
40 на 50	12 — „
50 на 60	16 50 „
Отк. 100	10 — „

Проба бумаги высылается за 60 к.
Иногород. заказы высылаются почтой нал. плат.
При оптовых заказах—скидка и вексельный кредит до 3-х месяцев.
Заказы и денежные переводы адресовать: Рязань, Советская пл., Из-ву „Рабочий Клич" и „Деревенская Газета".
Выполнение в недельный срок по получ. заказа.
Покупайте фотобумагу „АСТРА".
476.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня.

ПАНЯДЗЕЛАК, 23 студзеня 1928 г. — Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжу — Цэнтральны Камітэт ладзіць у Доме Культуры — ПАНЯДЗЕЛАК, 23 студзеня 1928 г.
ВЯЛІКІ ВЕЧАР
супольна з беларускімі пісьменьнікамі, тэатрам, музтэхнікумам, Дзіцячай Камісіяй ЦВК БССР
на карысьць дзяцей бяднейшых рабочых і сялян Заходняй Беларусі
КІНО — Абразкі з беларускіх фільмаў
ТЭАТР — Паказ БДТ-2 „ЧОРТ І БАБА" у новай пастаноўцы.
ЛІТАРАТУРА — Выступленьне паэтаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цішкі Гартнага, Міхася Чарота. Творы, прысьвечаныя Заходняй Беларусі.
МУЗЫКА. Л. Александроўская (рэпэртуар артыстычнага турнэ Франкфурт-Берлін-Стакгольм). А. БЯСЬСЬМЕРТНЫ—(сярыпка), М. ЗАСТОКАЎ (сьпевы), НАВІЦКІ (цымбалы), Ю. ПЯТРОЎ (раяль)), С. СТАНЮТА (дэклямацыя).
Студыйны хор—пад кір. А. Ягорава. (Рэпэртуар выкананы ў Маскве на выстаўцы дастацтваў народаў СССР).
Кіескі. Вайсковы аркестр. Лётарэя-алегры. Гульні. Буфэт.
ЗДЫМАЦЬ ВЕРХНЯЕ АДЗЕНЬНЕ АБАВЯЗКОВА.
Папярэдняя продаж білетаў: ЦК Чырвонага Крыжу (вул. Карла Маркса, № 3, тэл. 105), магазын Дзіцячай Камісіі (Савецкая, 90, тэл. 455), Інбелкульт (Рэвалюцыйная, 61, тэл. 771).

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА 1928 ГОД
НА ВЯЛІКУЮ БЕЛАРУСКУЮ ЧАСОПІСЬ ЛІТАРАТУРЫ, ПАЛІТЫКІ, ЭКАНОМІКІ, ГІСТОРЫІ, КРЫТЫКІ
„ПОЛЫМЯ"
(СЁМЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ)
пад рэдакцыяй: З. Жылуновіча (адказны рэдактар), М. Зарэцкага і Я. Лімаўоўскага.
У ЧАСОПІСІ ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ САМЫЯ ВЫДАТНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ЛІТАРАТУРНЫЯ І НАВУКОВЫЯ СІЛЫ.
ЧАСОПІСЬ «ПОЛЫМЯ» ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ПАЎТАРА МЕСЯЦЫ (8 кніжак на год) разьмерам кожны нумар 12-14 друкаваных аркушаў.
З ПЕРАШАЙ ПАЛОВЫ 1928 г. НАМЕЧАНА ДА ДРУКУ:
ПРОЗА: Я Пенавскі—„Па рубяжы сталецьця", раман; І. Бохар (chez : СН)э As Luisit) (Адзіная справядлівая вайна), раман, заборонены да друку ў Нямеччыне. Цішка Гартны—„Крыжавыя дарогі" (3-я частка раману „Сокі цаліны"); Тарас Гушча—„У палескай глушы" (У глыбі Палесься), 3-я частка, аповесьць; Я. Лімаўоўскі—„Над абрывам", аповесьць; В. Каваль—„Палын", аповесьць; М. Зарэцкі—„Заклаты мост", аповесьць; А. Дудар—„Балі паходні дагараюць", апавяданьне. Апавяданьні: Гергарт Поль, Ю. Фучык, Ф. Вейскопф, Ванчура і іншых. ПАЭЗІЯ: Якуб Колас—„На шляхох волі", паэма; Т. Кляшторы—„Сусьветны", паэма; Аляр. Александровіч—„Цені на сонцы", паэма; А. Дудар—„Кастрычнік", паэма. ВЕРШЫ: Янкі Купалы, І. Бохара, В. Маракова, М. Грамыкі, Гурло А., Гора, Клянторнага, Моркаўі А., Чарота і інш.
У 1928 годзе ў „Полымі" значна ўзмацняецца літаратурна-крытычны аддзел, у якім прымуць удзел: праф. І. Замоцін, праф. М. Піотуховіч, А. Барычэўскі, Ул. Дзяржынскі (Чаржынскі), Адольф Чэрны, Гэргарт Поль, М. Байноў, Тодар Глыбоцкі, А. Санкевіч і інш.
ГАДАВЫЯ І ПАЎГАДАВЫЯ ПАДПІСЧЫКІ „ПОЛЫМЯ" АТРЫМОЎВАЮЦЬ БЯСПЛАТНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ДАДАТАК (гл. газ. „Сав. Бел." № 295 за 1927 г. і „Зьвязда" ад 1 студзеня 1928 г.).
ПАДПІСНАЯ ЦАНА на „Полымя" з дадаткам: на год—10 р.; 6 м-цаў—5 р., 3 м-цы—2 руб. 50 к.
Даецца рассрочка: пры падпісцы 4 руб.—1 студзеня, 3 р. 50 к.—1 лютага; 2 р. 50 кап.—1 кастрычніка.
ЦАНА АДДЗЕЛЬНАГА НУМАРУ 1 р. 50 кап.
Падпісчыкі, прыслаўшыя поўнасьцю плату да 15-га ЛЮТАГА г. г., атрымоўваюць дадатак з першым запатрабаваньнем.
Падпіска прымаецца: у рэдакцыі часопісі „Полымя" (Менск, Савецк. 63); у Цэнтр. кнігарні ЛДВ (Менск, рог вул. Ленінскай і Савецк.); на ўсіх акруговых аддзяленьнях БДВ; на ўсіх паштовых аддзяленьнях, у галоўнай канторы газэты „Зьвязда" (Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх), у канторы падпіскі на газэты „Правда" і „Известия" (Менск, Савецкая, 61), у канторы падгазэты „Беларуская Вёска" (Менск, Савецкая, 63), і ад ўпаўнаважаных і сялькорамі на ўсіх райёнах БССР.
475

ЛЮДИ трудолюбивые изучают кустарные производства. Это дает подсобную трудовую профессию, обеспечивает на черный день и ограждает семью от НУЖДЫ.
Хороших практических результатов выработки на дому ходких предмет., товар. и препарат можно достичь только по руководству „Спутник Практика" Гуревичей и Энгельма, под ред. професс. Вальпис, так как авторы его дают практическ. советы и входят в переписку со своими подписчик. по всем вопросам, возникающ. в процессе работы. Ц. отд. рец.—75 к. Розн. и всего руководства (50 разд. отд., бол. 500 стр.)—6 р. 40 к. Раб., служ. и кустар. отпуск. по оптовой цене (со скидкой в 30 проц., то-есть за 4 руб. 48 к. в перепл. 10 к. без перепл., при условии непосредств. обращ. в ред. Высыл. немедленно по получен. зал. 65 к. (можно почт. марк.). Для ознакомл. высыл. подр. оглавл. за две 6 к. почт. марки.
Москва, Я. 767—а, Мало-Каменный пер. 8. Редакц. „Спутник Практика".

Ц. П. союзы „СЕЛЬХОЗЛЕСРАБОЧИХ"
с 21-го сего января
переместилось на площадь Свободы в Дом Труда, 2-ой этаж (при входе налево).

ИНЖЕНЕРЫ! ТЕХНИКИ, СТУДЕНТЫ!
Печатается и в ближайшее время выйдет в свет
ПЕРВЫЙ ТОМ
СЭП СПРАВОЧНИК ДЛЯ ЭЛЕКТРО-ТЭХНИКОВ.
Оригинальный коллективный труд, охватывающий все области электричества.
Участвуют свыше 40 крупных специалистов.
Общая редакция профессор. М. А. ШАТЕЛЕНА, В. Ф. МИТКЕВИЧА, В. А. ТОЛВИНСКОГО.
СЭП издается в 4 томах, об'емом около 3.000 страниц, свыше 2.500 рисунков, чертежей и диаграмм в изящных и прочных переплетах с золотым тиснением.
Все издание будет закончено в первой половине 1928 года.
Подробные проспекты по требован. бесплатно.
Издательство КУБУЧ, при Ленинградском Совете.
Ленинград, Мойка, 53.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакуманты лічыць несапраўднымі:

Пасьведчаньне Батура Т. С., выд. Самахвалавіцк. РВК. 1377
Конск. картка Батура Т. С., выд. Самахвалавіцк. РВК. 1378
Кандыдат. кн. Фаерштэйн Б. М., выд. МЦРК. 1379
Сяброўск. кн. Ермаковіча Н. А., выд. саюзам працасьветы. 1380
Бесправоўн. кн. Таес Ц. С., выд. Менстрахкасай. 1381
Зь пасьведчаньні аб працы Таес Ц. С., выд. доктарам Сітэрманам. 1382
Асабов. пасьведчаньне Сямёчыка П. П., выд. Вузьдзенск. РВК. 1383
Кансаньск. біл. № 237 Гурэвіча Л. М., выд. Менакругкомам ЛКСМБ 1384
Партбілет № 0411566 Зайцава Г. І., выд. Менск. парт. камісіяй 7-й кан. дывізіі. 1385

Кошт публікацыі аб згубе аднаго дакумэнту 50 кап.

ПРАДАЮЦЦА старыя газэты, ГАЗЭТНЫ ЗРЫЎ.
Зварочвацца ў кантору газэты „Зьвязда" з 9—3 гадз.

Друкарня газэты „Зьвязда"—Менск.